Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

2 КРАСАВІКА 2013 г. АЎТОРАК № 60 (27425) Кошт 1500 рублёў

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

ФУНДАМЕНТ АБ'ЯДНАЎЧЫХ ПРАЦЭСАЎ

Дарагія беларусы і расіяне!

У нас нямала агульных свят і памятных дат, але асаблівае месца сярод іх займае Дзень яднання. Ён з'явіўся дзякуючы волі нашых брацкіх народаў аб'яднаць намаганні і сумесна стварацьсваю будучыню.

Глыбока сімвалічна, што на фоне цэнтрабежных тэндэнцый 90-х гадоў XX стагоддзя на ўсёй постсавецкай прасторы толькі мы, беларусы і расіяне, пераадолеўшы масіраваны знешні націск, змаглі закласці асновы адзінства на новым гістарычным этапе. З таго часу нашы краіны прайшлі вялікі шлях. Вопыт беларуска-расійскай інтэграцыі паспяхова прыменены ў сучасных маштабных праектах — Мытным саюзе і Адзінай эканамічнай прасторы. Ён будзе выкарыстаны пры руху да наступнай пастаўленай намі мэты — Еўразійскага саюза. Мы прыйдзем да іншых арганізацыйных форм і ўзроўняў інтэграцыі, аднак фундаментам гэтых працэсаў назаўсёды застанецца гістарычнае рашэнне нашых народаў, прынятае 17 гадоў таму.

Сёння аб'ём беларуска-расійскага гандлю перавысіў ужо $43 млрд. Мы разам будуем АЭС, разам асвойваем космас, эфектыўна аб'ядноўваем патэнцыялы ў навуковай сферы, рэалізуем вялікую колькасць сумесных праектаў у розных галінах — ад прамысловасці і сельскай гаспадаркі да адукацыі і сацыяльных паслуг.

Мы сістэмна ўзаемадзейнічаем у галіне знешняй і абароннай палітыкі і таму, нягледзячы на новыя пагрозы і нестабільнасць у свеце, упэўнена глядзім наперад.

І самае галоўнае — гэта тое, што грамадзяне нашых краін не адчуваюць сябе чужымі ні ў Беларусі, ні ў Расіі.

У сучасных умовах аб'ектыўная патрэбнасць у далейшым збліжэнні толькі ўзмацняецца. Вынікі пасяджэння Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы пацвердзілі гатоўнасць і далей развіваць гэты інтэграцыйны праект. Мы дакладна вызначым яго абноўленыя прыярытэты, паставім канкрэтныя мэты і зробім Саюзную дзяржаву яшчэ больш эфектыўнай для росту дабрабыту нашых народаў. Упэўнены, што толькі сумеснай мэтанакіраванай работай мы зможам у поўнай ступені рэалізаваць існуючыя ў нас патэнцыялы, забяспечыць канкурэнтаздольнасць нацыянальных эканомік, устойлівы рост дзяржаў і гарантаваць дастойнае жыццё людзей.

Дарагія сябры!

Ад усёй душы віншую вас са святам — Днём яднання народаў Беларусі і Расіі.

Перакананы, што ідучае ад сэрца арганічнае імкненне нашых народаў да сумеснага дынамічнага развіцця будзе і ў далейшым паспяхова ўвасабляцца ў жыццё.

Здароўя вам, шчасця, міру і дастатку.

Няхай умацоўваецца непарушнае стратэгічнае партнёрства нашых краін!

Старшыня Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

2 красавіка 2013 года.

КУРС НА ЗБЛІЖЭННЕ ПАЦВЕРДЖАНЫ ЧАСАМ

Старшыня Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка з нагоды Дня яднання народаў Беларусі і Расіі накіраваў віншаванне Прэзідэнту Расійскай Федэрацыі Уладзіміру Пуціну.

«Правільнасць абранага намі курсу на збліжэнне і паўсюднае развіццё інтэграцыйных працэсаў пацверджана часам. Сёння дасягненні саюзнага будаўніцтва відавочныя. Высокія вынікі беларуска-расійскага супрацоўніцтва ва ўсіх сферах садзейнічаюць росту дабрабыту нашых грамадзян», — гаворыцца ў віншаванні.

Кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў упэўненасць, што пры актыўнай пазіцыі Уладзіміра Пуціна, нацэленасці на далейшае збліжэнне ўмацуецца інтэграцыйнае ўзаемадзеянне, якое адпавядае інтарэсам Беларусі і Расіі.

Аляксандр Лукашэнка таксама накіраваў віншаванне Старшыні Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы, Старшыні Урада Расійскай Федэрацыі Дзмітрыю Мядзведзеву. «Актыўны міжурадавы дыялог садзейнічае ўмацаванню інтэграцыйнага ўзаемадзеяння паміж нашымі краінамі. Няўхільны рост таваразвароту, паспяховая рэалізацыя сумесных праектаў у галіне навукі і інавацый, стварэнне ўмоў для забеспячэння роўных правоў грамадзян — важныя дасягненні саюзнага будаўніцтва», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

Віншавальныя пасланні з нагоды Дня яднання народаў Беларусі і Расіі накіраваны таксама Старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Валянціне Мацвіенка, Старшыні Дзяржаўнай Думы Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Сяргею Нарышкіну, Патрыярху Маскоўскаму і ўсяе Русі Кірылу, Дзяржаўнаму сакратару Саюзнай дзяржавы Рыгору Рапоту і іншым палітычным і грамадскім дзеячам.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«УПЛЫЎ РЫМСКА-КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВЫ Ў БЕЛАРУСКІМ ГРАМАДСТВЕ ВЯЛІКІ»

Рымска-каталіцкая царква мае вельмі важнае значэнне ў Беларусі, і яе ўплыў у беларускім грамадстве вялікі. Гэта адзначыў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з Мітрапалітам Мінска-Магілёўскім архібіскупам Тадэвушам Кандрусевічам.

Фота БЕЛТА

Кіраўнік дзяржавы па існуючай традыцыі ў святочныя Велікодныя дні наведаў Архікафедральны касцёл імя Найсвяцейшай Панны Марыі, у якім і адбылася сустрэча.

Прэзідэнт агледзеў святочнае ўбранне касцёла, паразмаўляў з прыхаджанамі.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў вернікаў Рымска-каталіцкай царквы, Тадэвуша Кандрусевіча, усіх свяшчэннаслужыцеляў з гэтым цудоўным і светлым святам.

Прэзідэнт Беларусі акцэнтаваў увагу на тым, што гэты год асаблівы, паколькі зусім нядаўна выбраны новы кіраўнік Рымска-каталіцкай царквы — Папа Рымскі Францыск.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Вельмі важна тое, што адбываецца сёння ў Рымска-каталіцкай царкве, таму што ні для каго не сакрэт, што ў нас у Беларусі Рымска-каталіцкая царква мае вельмі вялікае значэнне і яе ўплыў у нашым грамадстве вялікі. Таму для мяне неабыякава, які стан спраў у Рымска-каталіцкай царкве ў Беларусі».

У сваю чаргу Тадэвуш Кандрусевіч сказаў, што свята Вялікадня — асаблівае, і на душы радасць ад гэтага светлага дня.

Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі звярнуў увагу на важнасць дыялогу Рымска-каталіцкай і Праваслаўнай цэркваў. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў Беларусі часта праваслаўныя святкуюць каталіцкія святы, а католікі — праваслаўныя.

«Гэта трэба ператвараць у багацце», — прадоўжыў яго думку Тадэвуш Кандрусевіч і прыгадаў выказванне Папы Рымскага Іаана Паўла II аб тым, што «Еўропа павінна дыхаць двума лёгкімі».

У развіццё тэмы ўзаемадзеяння паміж дзвюма найбольш буйнымі рэлігійнымі канфесіямі ў Беларусі Тадэвуш Кандрусевіч расказаў аб запланаваным у 2014 годзе праваслаўна-каталіцкім форуме. На гэта важнае мерапрыемства збіраецца вялікая колькасць епіскапаў з розных дзяржаў.

СТАР. 2



Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

БЕЛЫ-БЕЛЫ КРАСАВІК

г. Мінск

■ Пункт адліку

ШТО АСАБІСТА ДЛЯ ВАС ЗНАЧЫЦЬ ДЗЕНЬ ЯДНАННЯ НАРОДАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ?

Старшыня ФНКА «Беларусы Расіі» Валерый КАЗАКОЎ (Масква):

Усякае добраахвотнае аб'яднанне ўжо само па сабе справа добрая, якое служыць будучыні нашых народаў. У дзевяностыя гады адбылася грандыёзная геапалітычная катастрофа, у выніку якой не толькі развалiліся Савецкі Саюз і Югаславія, два слупы славянскага і еўразійскага свету, але і свет у цэлым стаў набываць выродлівыя рысы аднапалярнасці. Войны і катаклізмы, якія рушылі за гэтым, — нішто іншае, як імкненне аднавіць справядлівую раўнавагу. Я як беларус ганаруся тым, што ініцыятарам мірных аб'яднальных працэсаў на постсавецкай прасторы стала наша Рэспубліка і яе Прэзідэнт.

2 красавіка для мяне хутчэй не свята, а пункт адліку новай рэальнасці вяртання да моцнай і вольнай дзяржавы, дзе чалавек сябе адчувае чалавекам, а не рабом алігархаў, дзе ў маіх дзяцей і ўнукаў ёсць прадказальная будучыня, а ў мяне годная старасць, а не тэрмін дажывання. І ўсе гэтыя спадзевы я злучаю з будучыняй Саюзнай дзяржавы.

Нацыянальнай самабытнасці, гісторыі, мовы, культуры пазбавіцца немагчыма, народ гэта наперакор усяму захавае і прыстасуе да новых рэальнасцяў. У немцаў ніхто не адняў іх нямецкасці, як ні імкнуліся ўсе паваенныя гады, а ў яўрэяў іх яўрэйскасць спрабуюць выбіць ужо некалькі тысяч гадоў. І які вынік? Гэта да таго, што, маўляў, будаўніцтва новага Саюза прывядзе да страты беларускай дзяржаўнасці і культуры. Усе гэтыя заявы не шчырыя. Калі дзяржаўнасць і культура ёсць, яны нікуды не знікнуць, а яны ў беларусаў ёсць!

Вялікае робіцца павольна і непрыкметна, як расце чалавек. Упэўнены, пройдзе яшчэ адно-два пакаленні, і мы будзем жыць у новай рэальнасці, імя якой Раўнапраўны Саюз народаў Еўразіі.

Доктар медыцынскіх навук Вольга АЛЕЙНІКАВА (Мінск):

Для беларускіх і расійскіх анколагаў Саюзная дзяржава мае практычнае значэнне. Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі разам з расійскімі падобнымі цэнтрамі распрацаваў канцэпцыю праграмы «Дзіцячая анкалогія і гематалогія», праект якой нядаўна разглядаўся на камісіі Парламенцкага сходу Беларусі і Расіі па сацыяльнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях. Гэтая праграма прадугледжвае стварэнне сеткі рэгістраў донараў касцявога мозгу ў Саюзнай дзяржаве. Гэта вельмі важна, бо генетычна народы Беларусі і Расіі вельмі блізкія, і такая сетка дазволіць знаходзіць больш донараў для трансплантацыі касцявога мозгу нашым пацыентам, не толькі дзецям, але і дарослым. Праграма таксама ўключае адкрыццё 8 лабараторый: трох у Беларусі і пяці ў Расіі, і 42 цэнтраў, якія будуць удзельнічаць у стварэнні рэгістраў донараў касцявога мозгу.

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:

«Мы з'яўляемся суседам Еўрасаюза. З суседзямі, як кажа наш Прэзідэнт, наканавана ад Бога жыць у міры, дружбе і згодзе. І мы гатовыя да гэтага. Але мы хочам, каб і да нас ставіліся прыстойна, паважліва, без усякага ціску і санкцый. Мы гатовыя падтрымліваць дружалюбныя адносіны на раўнапраўнай аснове. Лічым, што нармальныя стасункі з ЕС спрыялі б таму, каб Беларусь заставалася астраўком стабільнасці ў Еўропе і каб яна нікому не прыносіла ніякіх праблем».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 02.04.2013 г.

Долар ЗША	8670,00	■
Еўра	11110,00	■
Рас. руб.	278,50	▼
Укр. грыўня	1064,52	▲

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

СНЕГАПАДЫ ПАКІНУЛІ ПАЛЯКАЎ БЕЗ СВЯТЛА

З-за моцных снегападаў у Польшчы каля 100 тысяч чалавек засталіся без электрычнасці. Больш за ўсё ад стыхіі пацярпелі Мазавецкае і Падляскае ваяводствы. У прыватнасці, у варшаўскай энергасістэме святла пазбавіліся 80 тысяч чалавек. Паведамляецца, што там адключыліся каля дзвюх тысяч падстанцый. Акрамя таго, з-за снегападу істотна ўскладніўся рух на аўтатрасах краіны. З затрымкамі працуюць і аэрапорты, у тым ліку сталічны. У суседняй Чэхіі таксама прайшоў моцны снегапад, у выніку чаго снежны полаг дасягнуў вышыні ў 40 сантыметраў.

КІПР РОБІЦЬ СТАЎКУ НА КАЗІНО

Прэзідэнт Кіпра Нікас Анастасіадзіс пабудуе казіно на поўдні вострава. Такім чынам ён спадзяецца атрымаць дадатковыя фінансы для вываду краіны з эканамічнага крызісу. Раней усе ігральныя ўстановы знаходзіліся ў паўночнай частцы Кіпра, якая кантралюецца Турцыяй. Пры гэтым праваслаўная царква раней была супраць будаўніцтва казіно. Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы даручыў ураду скараціць колькасць рабочых месцаў для іншаземцаў. Паводле новай прапановы, працадавец павінен будзе мець штат, які на 70 працэнтаў складаецца з мясцовага насельніцтва. Паводле звестак СМІ, цяпер урад Кіпра робіць захады, якія будуць садзейнічаць эканамічнаму росту. Сярод іх — прыцягненне замежных інвестыцый і абарона слабаабароненых катэгорый насельніцтва.

ПАМЁР ВАЛЕРЫЙ ЗАЛАТУХІН

30 сакавіка, на 72-м годзе жыцця, памёр Валерый Залатухін, акцёр, які ў роўнай ступені заслужыў прызнанне сваімі ролямі ў тэатры і ў кіно. Амаль увесь сакавік ён знаходзіўся ў Расійскім цэнтры рэнтгенарадыялогіі, куды быў дастаўлены з анкалагічным захворваннем. У пачатку месяца Залатухін сышоў з пасады кіраўніка тэатра на Таганцы, з якім, перш за ўсё, і быў звязаны яго тэатральны лёс. З 1964 года Залатухін іграў у тэатры на Таганцы, а ў 1965 годзе стаў вядомы і як акцёр кіно. Усяго акцёр зняўся больш чым у 90 фільмах і серыялах, сярод іх — «Бумбараш», «Чарадзеі», «Гаспадар тайгі», «Жыццё і незвычайныя прыгоды салдата Івана Чонкіна», «Начны дазор» і іншыя.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў сувязі са смерцю народнага артыста РСФСР Валерыя Залатухіна накіраваў спачуванні яго родным, блізкім і калегам, паведамілі ў прэс-службе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ISSN 1990 - 763X

ПАКУЛЬ БУДЗЕ СНЕЖНА...

На працягу тыдня на тэрыторыі Беларусі захаваецца халоднае і вільготнае надвор'е, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

У аўторак амаль паўсюдна будзе ісці мокры снег, а раніцай на дарогах даволі слізка. Максімальная тэмпература ўдзень 1—7 цяпла. Прагназуецца, што атмасферны ціск павялічыцца ў сераду, таму ападкаў стане значна менш. Толькі ўначы месцамі ў Віцебскай вобласці, а ўдзень у паўднёвых раёнах будзе ісці мокры снег і дождж. На асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы на сераду 0 — мінус 6 градусаў, пры праясненнях — да 7—12 марозу, удзень — плюс 1—6, на поўдні да 8 цяпла.

Сіноптыкі прагназуюць, што 4 і 5 красавіка надвор'е зноў сапсуецца, бо атмасферныя франты з боку паўднёвага захаду Еўропы прынясуць да нас мокры снег і дождж. Увага! Месцамі чакаюцца моцныя ападкі і наліпанне мокрага снегу. У асобных раёнах туман, уначы і раніцай галалёд, а на дарогах галалёдзіца.

Сяргей КУРКАЧ.

БПС-СБЕРБАНК

ПРЕДЛОЖЕНИЕ (ПУБЛИЧНАЯ ОФЕРТА) держателям банковских платежных карточек ОАО «БПС-Сбербанк» по заключению дополнительного соглашения к договору карт-счета

Законом Республики Беларусь от 13.07.2012 № 416-З «О внесении дополнений и изменений в Банковский кодекс Республики Беларусь», постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 18.01.2013 № 34 «Об утверждении Инструкции о порядке совершения операций с банковскими платежными карточками» в законодательство Республики Беларусь внесены отдельные изменения по вопросам совершения операций с банковскими платежными карточками, в том числе термин «банковская пластиковая карточка» изменен на «банковская платежная карточка», исключено понятие «карт-счет».

В связи с указанными изменениями в законодательстве ОАО «БПС-Сбербанк» (далее – Банк) предлагает физическим лицам, у которых с Банком заключены договоры карт-счета (далее – Клиентам), заключить дополнительные соглашения к действующим договорам карт-счета с целью приведения их в соответствие с законодательством Республики Беларусь.

Дополнительные соглашения не затрагивают порядок проведения операций с карточками.

Замена карточек в связи с заключением дополнительного соглашения к договору карт-счета не требуется.

ОАО «БПС-Сбербанк» размещает настоящее предложение (публичную оферту) в сети Интернет на веб-сайте по адресу www.bps-sberbank.by, на стендах Банка и в газете «Звязда» для обеспечения возможности оформления дополнительного соглашения к договору карт-счета без необходимости посещения Клиентами офисов Банка.

Для заключения дополнительного соглашения к договору карт-счета Банк размещает настоящую публичную оферту, а Клиентам Банка для ее акцепта (согласия) предлагается совершить любую расходную операцию с использованием банковской платежной карточки (далее – карточка) или ее реквизитов (снятие наличных денежных средств, проведение оплаты товаров, работ и (или) услуг и др.).

Дополнительное соглашение к договору карт-счета, заключенному между Банком и Клиентом, считается заключенным в момент акцепта Клиентом настоящего предложения с соблюдением следующих условий:

- договор карт-счета на момент акцепта является действующим;

- акцепт Клиентом настоящего предложения должен быть осуществлен в период с 1 апреля 2013 года по 31 октября 2013 года путем совершения любой расходной операции с использованием банковской платежной карточки, оформленной в рамках договора карт-счета, или ее реквизитов (снятие наличных денежных средств, проведение оплаты товаров, работ и (или) услуг и др.).

Клиенты, не осуществившие расходные операции в указанный период, могут обратиться в подразделение Банка, в котором был заключен договор карт-счета, не позднее 29 ноября 2013 года для заключения дополнительного соглашения к договору карт-счета в письменной форме.

Настоящее предложение может быть отозвано путем опубликования извещения об отзыве настоящего предложения в сети Интернет на веб-сайте по адресу www.bps-sberbank.by, на стендах Банка и в газете «Звязда».

Дополнительное соглашение к договору карт-счета

С момента акцепта настоящего предложения вступает в силу дополнительное соглашение к договору карт-счета на следующих условиях:

1. В наименовании и по тексту договора слова «карт-счет» заменить словами «текущий (расчетный) счет с использованием банковской платежной карточки» в соответствующих падеже и числе, слова «банковская пластиковая карточка» заменить словами «банковская платежная карточка» в соответствующих падеже и числе.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 10.10.2011 г. УНП 100219673. ОАО «БПС-Сбербанк»

УПЛЫЎ РЫМСКА-КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВЫ Ў БЕЛАРУСКІМ ГРАМАДСТВЕ ВЯЛІКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У час сустрэчы Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі падарыў Прэзідэнту ўнікальнае выданне — Біблію на сучаснай беларускай мове.

Аляксандр Лукашэнка паднёс у дар Тадэвушу Кандрусевічу велікоднае яйка з дрэва, выкананае ва ўнікальнай тэхніцы Сожская (або Гомельская) скань. Аснова яйка адлюстроўвае Галгофу, унутры сферы размешчаны мініяцюрны крыж з распяццем. Па баках — два разныя медальёны з выявай Панны Марыі і Ісуса Хрыста. Вянчае яйка фігура Хрыста.

Рымска-каталіцкая царква адыгрывае істотную ролю ў рэлігійным жыцці Беларусі, з'яўляючыся другой па колькасці вернікаў канфесіяй у краіне. За апошнія 20 гадоў колькасць рэлігійных абшчын Рымска-каталіцкай царквы павялічылася ў 4 разы. Па стану на 1 студзеня 2013 года налічваецца 483 прыходы, аб'яднаныя ў 4 епархіі (Мінска-Магілёўская, Гродзенская, Віцебская, Пінская). У краіне дзейнічаюць 11 рымска-каталіцкіх місій і 9 манаскіх абшчын. Абшчыны маюць 476 касцёлаў, яшчэ 26 знаходзяцца ў стадыі будаўніцтва. У прыходах Рымска-каталіцкай царквы працуюць 439 свяшчэннаслужыцеляў.

Сталі шырока вядомымі мерапрыемствы, якія праводзяцца пад эгідай Рымска-каталіцкай царквы ў сферы культуры, такія як міжнародны фестываль хрысціянскай музыкі «Магутны Божа» ў Магілёве. РКЦ актыўна займаецца дабрачыннай і сацыяльнай дзейнасцю, аказвае дапамогу маламаёмным.

У Беларусі ў гэтым годзе будзе ўрачыста адзначацца 400-годдзе знаходжання абраза Маці Божай у касцёле Ушэсця Маці Божай у Будславе. На гэту ўрачыстасць збіраюцца прыбыць прадстаўнікі епіскапатаў з розных дзяржаў, а таксама вернікі.

Цяпер прадаўжаецца работа над Пагадненнем аб супрацоўніцтве паміж Беларуссю і Святым Прастолам, праект якога праходзіць завяршальную стадыю ўзгаднення.

Прэс-служба
Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ШТО АСАБІСТА ДЛЯ ВАС ЗНАЧЫЦЬ ДЗЕНЬ ЯДНАННЯ НАРОДАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ?

Пісьменнік Алесь КАЖАДУБ (Масква):

Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі асабіста для мяне значыць вельмі шмат. Па сутнасці, мая сям'я і ёсць увасабленне гэтага яднання. Я беларус, жонка — руская, жыву ў Маскве, часта бываю ў Беларусі. Сын вучыцца ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце на факультэце паліталогіі і, натуральна, цікавіцца беларуска-расійскімі адносінамі. Мы ўсе зацікаўлены ў іх паляпшэнні. Павінен сказаць, многія ў Расіі пільна сочаць за тым, што адбываецца ў Беларусі, як працуе беларуская эканамічная мадэль, як і чым жывуць простыя людзі.

Што да будучыні Саюзнай дзяржавы, то тут, вядома, не ўсё бясхмарна, аднак і тэндэнцый да яе разбурэння я не бачу. Аб'яднальныя працэсы цяпер у свеце больш запатрабаваны, чым раз'яднальныя. Асабліва гэта відаць падчас сусветнага крызісу. У Саюзнай дзяржаве ўжо выпрацавана пэўная мадэль, засталося ісці да яе ажыццяўлення.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Касманаўт Алег НАВІЦКІ (Зорны гарадок):

Я не задумваюся, да якога народа належу: беларускага альбо рускага. Напэўна, таму, што нарадзіўся і вырас у Савецкім Саюзе, і мне бліжэй тое, што ёсць агульнага. І расіяне, і беларусы аднолькава для мяне дарагія. Раз'яднаць беларусаў і рускіх немагчыма, бо мы надта доўга жылі разам у адной вялікай краіне, і ў свядомасці многіх людзей гэта так і засталося.

Разам з тым, калі я перасякаю беларускую мяжу, мяне ахоплівае адчуванне вяртання дадому. Можа, таму, што гэта адбываецца вельмі рэдка — толькі раз на год. З асаблівым пачуццём я ўглядаюся ў родныя мясціны і з космасу. Убачыць Беларусь удалося далёка не адразу. Чамусьці, калі арбіта праходзіла далёка ад нашых мясцін, над Мінскам было сонечна, а як толькі арбіта набліжалася, адразу зацягвалася ўсё аблокамі. І толькі ў апошні месяц палёту мне ўдалося зрабіць здымкі Мінска і роднага Чэрвеня, чаму я невыказна быў рады!

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

■ Добрая навіна

ТАРЫФНАЯ СТАЎКА ПЕРШАГА РАЗРАДУ ЗНОЎ ПАВЫСІЛАСЯ

З 1 красавіка ў Беларусі тарыфная стаўка першага разраду для аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый павялічылася да Br250 тыс. Такое рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў ад 29 сакавіка 2013 года № 226.

У гэтым жа дакуменце змяшчаюцца карэкціруючыя каэфіцыенты да разлічаных па Адзінай тарыфнай сетцы (АТС) работнікаў Рэспублікі Беларусь тарыфных ставак (акладаў) работнікаў бюджэтных арганізацый, якія тарыфікуюцца 1-27 разрадамі, у памерах 3,50-1,00.

У бліжэйшы час рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, кіраўнікі бюджэтных арганізацый (і іншых арганізацый, якія атрымліваюць субсідыі, работнікі якіх прыраўнаваны па аплаце працы да работнікаў бюджэтных арганізацый) павінны правесці перараслік заработнай платы ў адпаведнасці з установленай тарыфнай стаўкай першага разраду і каэфіцыентамі АТС з улікам карэктуючых каэфіцыентаў. Падобнае рашэнне прынята, каб забяспечыць далейшы рост узроўню аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый, павысіць пакупніцкую здольнасць іх заработнай платы, а таксама часткова аднавіць дыферэнцыяцыю ў аплаце працы бюджэтнікаў.

Нагадаем, што папярэдні раз тарыфная стаўка першага разраду ў нашай краіне павышалася з 1 студзеня 2013 года да Br240 тыс. Дыяпазон карэктуючых каэфіцыентаў да тарыфных ставак (акладаў) работнікаў, якія тарыфікуюцца 11-21 разрадамі, быў зменены да 1,538-1,010.

Надзея ДРЫЛА

■ Паводка

Лакальныя падтапленні

За выхадныя дні паводкавая сітуацыя ў палескіх раёнах Брэстчыны асабліва не памянялася. Паводле інфармацыі абласной службы МНС, у зоне падтаплення аказалася каля 40 падворкаў і чатыры жылыя дамы Столінскага раёна.

Спецыяльныя службы Століншчыны і Піншчыны рыхтуюцца да прыходу вялікай вады. Напрыканцы мінулага тыдня ў Століне праведзена пасяджэнне камісіі па надзвычайных сітуацыях. Ацэньвалася перадпаводкавая сітуацыя, удакладняліся задачы па ўзаемадзеянні службаў на выпадак вялікай вады. Асабліва старанна рыхтуюцца да яе падраздзяленні МНС, у якіх ёсць спецыяльная тэхніка. Плывучыя транспарцёры, маторныя і вёславыя лодкі, агрэгаты для адпампоўвання вады гатовыя прыйсці на дапамогу людзям.

Яна СВЕТАВА.

Магілёўшчына напагатове

У Магілёўскай вобласці рыхтуюцца да вялікай паводкі. Паводле спецыялістаў, сёлета ўзровень вады ў рэках можа перавысіць паказчыкі мінулых гадоў. Мяркуецца, што на Бярэзіне і Сажы будзе вялікае разводдзе.

Падлічылі, што падтапленні пагражаюць больш чым 1200 дамам у 13 населеных пунктах. У зоне рызыкі апынуліся прыкладна па 500 дамоў у Магілёве і Бабруйску, а таксама па паўсотні ў Шклове і Чавусах. У гэтым спісе — вёскі Слаўгарадскага і іншых раёнаў.

На гэтым тыдні сіноптыкі прагназуюць надыход (нарэшце!) сапраўднай вясны і ўстойлівых плюсавых тэмпературах, таму ўлады вырашылі не марнаваць час. На гэтым тыдні будзе зроблены падваровы абход там, дзе чакаюцца падтапленні. Людзям яшчэ раз нагадаюць пра меры бяспекі: зрабіць адвод вады, вынесці харчы з падвалаў і, самае галоўнае, не забыцца застрахаваць сваю маёмасць.

Ілона ІВАНОВА.

Прыпяць на пойме

На Мазыршчыне Прыпяць перавысіла небяспечна высокі ўзровень амаль на паўметра. Сёння ён складае 549 см, вада разлілася па пойме ракі. Паводкавымі водамі тут падтоплена 178 падворкаў, 128 гаспадарчых пабудоў, 106 дачных дамкоў, у асноўным, у раёне вёскі Лубня. У прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС паведамілі, што пачатак падтаплення домаўладальніцтваў прагназуецца пры ўзроўні вады ў раёне 637 см.

У Жыткавіцкім раёне, каля гідрапаста вёскі Чэрнічы ўзровень вады склаў 506 см, вада ўжо на пойме. Пры гэтым паводкавымі водамі падтоплена 9 падворкаў і адна гаспадарчая пабудова ў вёсках Пераройскі Млынок, Перароў, Запясочча. Да пачатку падтапленняў у Тураве і вёсцы Пагост неабходна ўзняцце ўзроўню вады ў Прыпяці яшчэ на 48 см. Зараз жыццезабеспячэнне населеных пунктаў не парушана.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Ліквідацыя ледзяных затораў на рацэ Чэрніца.

Фота БЕЛТА.

■ Парламенцкі дзённік

Бізнесмены просяць абараніць лёгкую прамысловасць і зацікавіць іх у экспарце

У Наваполацку адбылося выязное пасяджэнне Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, прысвечанае заканадаўчаму ўдасканаленню падатковай палітыкі. Запрошаныя на пасяджэнне прадстаўнікі сярэдняга бізнесу хадайнічалі перад заканатворцамі аб выратаванні айчыннай лёгкай прамысловасці і палягчэнні ўмоў для знешнеэканамічнай дзейнасці, а таксама аб вяртанні эколагічнага падатку ў мясцовы бюджэт. Пра апошняе, праўда, папрасілі не бізнесмены, а кіраўніцтва горада. Аднак і першыя, і другія ў сваіх прапановах і заўвагах былі салідарныя.

Падатковая сістэма — бізнесу

— З 2006 года падатковая сістэма Беларусі вельмі актыўна рэфармуецца, — запэўніла бізнесменаў намеснік міністра па падатках і зборах Эла СЯЛІЦКАЯ. — Мы імкнёмся зрабіць кароткі і няцяжкі пералік падаткаў, а адносіны паміж дзяржаўнымі органамі і плацельшчыкамі простымі і зручнымі. Асноўная наша задача — увайсці ў 30-ку першых краін сукупнага рэйтынгу па паказчыку спрыяльных умоў вядзення бізнесу і заняць сама мала 70-е месца па індыкатары «падаткаабкладанне». Аднак да 2011 года па падаткаабкладанні мы не маглі зрушыцца з апошняга 183-га месца. І толькі ў апошнія два гады ўдалося падняцца на 129-ы радок. Месца ў сусветным рэйтынгу — не самамэта. Галоўная мэта падатковай палітыкі — садзейнічанне эканамічнаму росту нашай краіны.

За апошнія 6 гадоў падаткоўцы цяжар для бізнесу ў Беларусі быў зніжаны на 10%, адменена 26 плацяжоў, па 9 падатках зніжаны стаўкі. Пераход на новы парадак фарміравання інавацыйнага фонду дазволіў пакінуць у распараджэнні плацельшчыкаў каля BrЗ трлн.

Удзельнікі выязной парламенцкай камісіі прадэманстравалі айчынным бізнесменам, наколькі сёння прывабным для іх з'яўляецца падатак на прыбытак. З мінулага года стаўка яго (18%) самая нізкая сярод краін Мытнага саюза і АЭП і адна з самых нізкіх у Еўропе. Абагнала нас Ірландыя (12%), побач — Польшча, Венгрыя, Славакія (19%). У астатніх краінах стаўкі падатку на прыбытак вышэйшыя.

Уведзены новы механізм стымуляцыі інвестыцый — амартызацыйная прэмія. Як толькі плацельшчыкі набываюць асноўныя сродкі, аб'екты нерухомасці, яны маюць права аднесці да выдаткаў 10% ад першапачатковага кошту аб'екта нерухомасці і 20% — па астатніх асноўных сродках. Акрамя таго, працягваецца работа па збліжэнні падатковага ўліку з бухгалтарскім, каб у выніку звесці да мінімуму ўсе падатковыя карэкціроўкі і даць магчымасць бухгалтару вылічыць падатак проста.

З ПДВ горш

Падатак да дабаўленую вартасць складае 20%: гэта вышэй, чым у суседзяў па АЭП (у Расіі — 18%, Казахстане — 19%), але ніжэй, чым у іншых еўрапейскіх краінах (у Польшчы — 22%, Літве — 21%, Украіне — 23%).

«Бізнес праводзіць актыўную палітыку па зніжэнні стаўкі гэтага падатку, і мы разглядаем гэтае пытанне, але сёння ПДВ — асноўная крыніца даходу дзяржаўнага бюджэту, яго ўдзельная вага — 22% (падатак на прыбытак —19%, падаходны падатак —19%, акцызы — 10%), і нават калі знізіць стаўку на 1%, бюджэт недаатрымае каля Br1 трлн. Таму сёння гэтае пытанне пакуль не актуальнае», — не стала абнадзейваць бізнесменаў намеснік міністра.

Падатковае міністэрства шукае іншыя перавагі для бізнесу ў Беларусі, напрыклад, за кошт падатковага адміністравання. «Тыя, хто працуе на экспарт, адчувае, як хутка мы вяртаем падатак на дабаўленую вартасць, — упэўнены распрацоўшчыкі новага заканадаўства. — У гэтым выпадку адбываецца вылічэнне ўваходнага падатку незалежна ад абаротаў рэалізацыі, і на працягу месяца ёсць магчымасць вярнуць яго плацельшчыку. Летась, для таго, каб экспарцёр мог яго вярнуць, абавязковай умовай было атрыманне выручкі ад аперацый, якія абкладаліся гэтым падаткам. Сёлета гэта абмежаванне ліквідавана».

Бізнес хадайнічае

Прадстаўнікі бізнесу пагадзіліся, што працаваць апошнім часам у Беларусі стала лягчэй, разам з тым яны ўказалі на шэраг недахопаў у заканадаўстве, звязаных як з падаткамі, так і з іншымі ўмовамі вядзення бізнесу.

— Так, вы вяртаеце ПДВ пры экспарце на працягу месяца, але робіце гэта з моманту афармлення заявы аб вяртанні, — заўважыў намесніку міністра дырэктар прадпрыемства па вытворчасці трансфарматараў «Юджэн» Уладзімір РАГАЎНЁЎ. — А тавар за мяжу можа быць адгружаны за 3-4 месяцы да афармлення такой заявы. Бо, напрыклад, расіянін, атрымаўшы ад нас тавар, заяву аб выплаце ўскосных падаткаў павінен прадаставіць нам на працягу паўгода, і добра, калі ён зробіць гэта раней. І толькі пасля гэтага мы можам вяртаць ПДВ. У выніку мне больш выгадна адгрузіць тавар спажыўцу ў Беларусі, бо я ў тым жа месяцы атрымаю грошы. У мяне ўвогуле ніякай, акрамя маральнага ўсведамлення, што я зарабляю валюту для дзяржавы, зацікаўленасці ў экспарце прадукцыі няма.

Выраўняць падатак на дабаўленую вартасць пры экспарце прадукцыі на Расійскую Федэрацыю хаця б для фізічных асоб прапанаваў Уладзімір ЗАЛЕНСКІ, дырэктар прадпрыемства «Інтэрфорэст», якое спецыялізуецца на драўляным домабудаванні. Гэта дазволіць стварыць роўныя ўмовы для канкурэнцыі, бо такая прадукцыя абкладаецца ў нас 20-працэнтным падаткам, а ў Расіі — 18-працэнтным.

— Калі я адкрываю новую вытворчасць, стварааю новыя працоўныя месцы, то зменшыце мне на працягу першых 5 гадоў выплаты ў Фонд сацыяльнай абароны напалову, — прасіў дэпутатаў дырэктар трыкатажнай фабрыкі «ЛюбаваЛЮКС» Вячаслаў МАЛІНОЎСКІ. — Тады ў мяне з'явіцца інтарэс, я змагу падняць заробкі. Калі я ўкладу інвестыцыі ў абсталяванне і тэхналогіі, кампенсуйце мне частку выдаткаў шляхам ільгот на падаткі на працягу года. Бо потым я заплачу вам больш падаткаў, і дзяржава толькі выйграе. Інакш мы загубім лёгкую прамысловасць. Сёння ўжо шыць адзенне і абутак больш выгадна за мяжой, чым у Беларусі.

— Усе выказаныя бізнесменамі прапановы і заўвагі справядлівыя, — падсумавала вынікі выязнога пасяджэння Людміла ДАБРЫНІНА, старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў. — Вельмі важна пытанні, якія закранаюць эканамічныя і сацыяльныя працэсы нашай краіны, абмяркоўваць разам з тымі, каго яны непасрэдна датычацца: прадпрымальнікамі, падатковымі органамі, прадстаўнікамі мясцовай улады.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

г. Наваполацк

■

ФАКТЫ НАВІНЫ ПАДЗЕІ

НАВУЧЫЦЦА ПРАЦАВАЦЬ НА РОЎНЫХ

У Магілёўскім цэнтры гарадскіх інфармацыйных сістэм створана майстэрня па адаптацыі да працы людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Па беларуска-дацкім праекце адкрыта 5 працоўных месцаў. У разлікова-касавым цэнтры № 5 створана дыспетчарская служба, дзе новыя работнікі прымаюць паказанні лічыльнікаў расходу вады. На працу прыняты чатыры жанчыны і малады чалавек, яны маюць 2 і 3 групы інваліднасці. Іх узрост — ад 22 да 40 гадоў. Да працы іх дапусціла экспертная камісія, і цяпер яны знаёмяцца з калектывам і прызвычайваюцца да новага жыццёвага графіка. Ва ўстанове падкрэслілі, што ўмовы працы тут камфортныя для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Калегі ставяцца да іх дружалюбна. «Новенькім» імкнуцца паказаць, што іх не шкадуюць, яны з усімі на роўных. У працэсе адаптацыі новым работнікам будзе дапамагаць псіхолаг. Калі ўсё пройдзе паспяхова, то цэнтр гатовы працягнуць з імі працоўныя адносіны. Цяперашнія дагаворы падпісаны на год.

— Тут двайная карысць: з аднаго боку, мы выконваем важную сацыяльную функцыю, — лічыць дырэктар цэнтра інфармацыйных сістэм Алена Бальшакова. — А з другога, павышаем якасць і хуткасць абслугоўвання людзей, якія тэлефануюць з паказаннямі лічыльнікаў.

У Магілёве гэты праект будзе працягнуты. У цэнтры сацыяльных работ для інвалідаў мяркуецца стварыць невялікую швейную майстэрню. У горадзе жывуць больш за 16,5 тысячы людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Летась пры садзейнічанні службы занятасці ўдалося знайсці працоўныя месцы для 154 з іх.

Ілона ІВАНОВА.

ДАХ АБРЫНУЎСЯ

59-гадовы будаўнік загінуў, а 39-гадовы траўмаваны пры абвальванні даху дрэваапрацоўчага цэха ў сельгаспрадпрыемстве «Чырвоная Армія» Рагачоўскага раёна.

У прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС расказалі, што здарэнне адбылося падчас работ па ўзмацненні апорнай канструкцыі будынка, дзе напярэдадні быў праведзены дэмантаж адной са сцен. Пакуль будавалася новая бакавая сцяна, працоўныя ўсталявалі дах на падпоркі. Работы ажыццяўляліся гаспадарчым спосабам, без праекта. Выратавальнікі мяркуюць, што на частковае абвальванне даху магла паўплываць і «шапка» снегу, якая ўтварылася за апошнія дні. У выніку пад заваламі апынуўся рабочы, які, па словах старшыні гаспадаркі, са снежня 2012 года знаходзіўся на амбулаторным лячэнні, а ў дзень трагедыі прыйшоў у цэх для правядзення работ на дрэваапрацоўчым станку ў асабістых мэтах. Другі будаўнік са шматлікімі траўмамі галавы шпіталізаваны ў раённую бальніцу. Следчыя органы высвятляюць падрабязнасці.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ПЕШАХОД ЛЯЖАЎ НА ДАРОЗЕ

У нядзелю ўвечары ў вёсцы Любонічы Кіраўскага раёна на дарозе загінула жанчына. Малады чалавек з Бабруйска, які кіраваў аўтамабілем, не заўважыў ляжачага пешахода.

Ад атрыманых траўмаў 51-гадовая жыхарка вёскі памерла на месцы. Паводле папярэдняй інфармацыі, такая сітуацыя магла быць вынікам алкагольнага ап'янення жанчыны. Магілёўская ДАІ яшчэ раз нагадвае ўсім пра тое, што дарога і алкаголь не спалучаюцца. Штрафы вялізныя, адказнасць аж да крымінальнай, але самае галоўнае — жыццё чалавека. Між тым, за мінулыя пятніцу і выхадныя дні ў Магілёўскай вобласці затрымана 40 нецвярозых вадзіцеляў, якім забаранілі кіраваць аўтамабілямі.

Ілона ІВАНОВА.

БАТЭ І МІНСКАЕ «ДЫНАМА» ПАДЗЯЛІЛІ БАЛЫ

Першы тур чэмпіянату Беларусі па футболе сенсацыі не прынёс, а галоўны матч выхадных пераможцу так і не выявіў.

У Жодзіне сустракаліся каманды, якія, між іншым, разам з салігорскім «Шахцёрам» з'яўляюцца асноўнымі прэтэндэнтамі на ўзнагароды першынства — БАТЭ і мінскае «Дынама». Матч хоць і праходзіў на нейтральным стадыёне, але здолеў сабраць добрую аўдыторыю. Выдатнай гульні ад любімцаў балельшчыкі не пабачылі. Праўда, барысаўчане правялі нядрэнны першы тайм і выйшлі наперад дзякуючы трапнаму «стрэлу» Аляксандра Глеба. Зраўняць лік дынамаўцы здолелі толькі на апошняй, 4-й, дабаўленай хвіліне сустрэчы. 1:1 — лічбы на табло, якія, напэўна, хутчэй расчаравалі, чым задаволілі каманду Віктара Ганчарэнкі.

Астатнія матчы прынеслі наступныя вынікі: «Мінск» — «Тарпеда» (Жодзіна) — 0:0, «Нафтан» (Наваполацк) — «Шахцёр» (Салігорск) — 0:1, «Дняпро» (Магілёў) — «Гомель» — 2:1, «Белшына» (Бабруйск) — «Дынама» (Брэст) — 1:0, «Нёман» (Гродна) — «Славія» (Мазыр) — 2:0.

Тарас ШЧЫРЫ.

АПАВЯШЧАЛЬНІКІ НЕ СПРАЦАВАЛІ: НЕ БЫЛО БАТАРЭЕК...

У Мінску на пажары загінуў мужчына. Як высветлілася потым, у двух аўтаномных пажарных апавяшчальніках, якімі кватэра была абсталявана пасля капітальнага рамонту, гаспадары не замянілі батарэйкі...

Пра пах дыму з кватэры на трэцім паверсе дзевяціпавярховага жылога дома па вуліцы Казінца жыльцы паведамілі сталічным пажарным-выратавальнікам удзень. Падчас разведкі ў жыллі, дзе было моцнае задымленне, было ўстаноўлена, што гарыць хатняя маёмасць на плошчы 8 квадратных метраў. Пры тушэнні было знойдзена цела гаспадара — пенсіянера 1940 года нараджэння. З суседняга пакоя работнікі МНС выратавалі яго сына 1970 года нараджэння. Мужчына ў стане алкагольнага ап'янення з папярэднім дыягназам «тэрмаінгаляцыйная траўма, атручэнне чадным газам, апёкі левай галёнкі» быў шпіталізаваны. Мяркуецца, што прычынай пажару стала неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні. Па словах суседзяў, гаспадар злоўжываў алкаголем. Дарэчы, кватэра пасля капітальнага рамонту мела два аўтаномныя пажарныя апавяшчальнікі, якія не спрацавалі з-за адсутнасці элементаў сілкавання — гаспадары іх папросту не замянілі. Інакш гук апавяшчальнікаў павінен быў бы разбудзіць мужчын, якія спалі, і трагедыі ўдалося б пазбегнуць...

Сяргей РАСОЛЬКА.

НАДЗЕЙНАСЦЬ У ПАРТНЁРСТВЕ

Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі звязаны з датай падпісання ў 1996 годзе Дагавора аб Садружнасці Беларусі і Расіі. Гэта быў, па сутнасці, першы рашучы крок на прасторы СНД па аднаўленні шматбаковых адносін на сістэмнай аснове з боку дзвюх дзяржаў, значэнне якіх для развіцця СССР было ключавым.

Прычыны для яго былі таксама відавочныя. Беларусь, пасля таго, як яе эканоміка была амаль цалкам знішчана фашысцкімі акупантамі, адбудоўвалася як зборачны цэх усяго Савецкага Саюза, і ў першую чаргу Расіі. Гэта цягнула за сабой два відавочныя наступствы. Па-першае, у выніку эканоміка Беларусі магла функцыянаваць на высокім узроўні толькі ва ўмовах завозу з Расіі вялізнай колькасці сыравіны і камплектных частак, неабходных для вырабу гатовай прадукцыі на вялікіх беларускіх заводах. Па-другое, збыт вырабленай прадукцыі таксама ў асноўным залежаў ад гатоўнасці прыняць гатовыя тавары расійскай эканомікай, для патрэб якой і адбудоўваліся сотні беларускіх заводаў.

Акрамя гэтага, беларускія тавары цудоўна ведалі і цанілі расійскія спажыўцы, што немалаважна для збыту, але яны былі не вядомы ў ЕС. Таму імкненне беларускага кіраўніцтва пасля прэзідэнцкіх выбараў 1994 года рэінтэграваць эканоміку з расійскай грунтавалася на разуменні структурных асаблівасцяў эканомікі Беларусі і ў выніку прывяло да хуткага эканамічнага росту. Дарэчы, 1996 год і стаў першым годам, калі замест падзення эканомікі, якое пачалося з крахам СССР, Беларусь змагла прадэманстраваць эканамічны рост.

У Расіі, у сваю чаргу, пасля доўгіх дыскусій пра тое, як ёй дапаможа Захад, і пра тое, як яна заквітнее, пазбавіўшыся ад неабходнасці «ўтрымліваць» былыя саюзныя рэспублікі, таксама выявілі відавочныя непрыемныя факты. Першы з іх складаўся ў тым, што Захад ніякім чынам не збіраўся Расіі ні ў чым карысным для яе дапамагаць, а з радасцю забіраў усё тое, што Расія пакінула без увагі. Пераключаў на сябе асноўных партнёраў Расіі, рыхтуючы частку з іх да ўступлення ў НАТА, удзельнічаў у разрабаванні расійскай эканомікі.

Другі факт заключаўся ў тым, што Расія страціла практычна цалкам уплыў на міжнароднай арэне, што было вельмі балюча для насельніцтва краіны, якое раней прывыкла, што СССР з'яўляецца адным з двух цэнтраў біпалярнага свету. Прыйшло і разуменне, што без надзейных саюзнікаў уплываць на сусветныя пытанні немагчыма.

Трэці — у тым, што з кожным годам знікала абараназдольнасць краіны. І больш за ўсё на тым самым заходнім кірунку, якога перасталі неабгрунтавана асцерагацца пасля краху СССР. У сувязі з гэтым адносіны з Беларуссю і Украінай сталі асабліва важнымі.

Чацвёрты факт — праблемы ў эканомікі, нягледзячы на праведзеную шокавую прыватызацыю, не вырашаліся, а пагаршаліся, і абяцаны заходнімі дарадчыкамі швейцарскі ўзровень жыцця ў выніку рэформаў усё больш выглядаў адкрытым здзекам. Сыравінны сектар эканомікі дэградаваў з-за хаосу ў выніку перадзелу ўласнасці і нежадання новых уласнікаў інвеставаць у часта незаконна атрыманыя актывы. Несыравінны сектар прыходзіў у запусценне ад таго, што, парваўшы ранейшыя сувязі з саюзнымі рэспублікамі, Расія пазбавіла многія прадпрыемствы як магчымасці пастаўляць камплектуючыя, так і ранейшых рынкаў збыту. Асабліва пацярпелі ў выніку навукаёмістыя вытворчасці, паколькі вялізная колькасць навуковых цэнтраў і навукоўцаў засталася за межамі Расіі. Усведамленне рэальнага становішча спраў прывяло да адмовы ад ранейшай манеры разважаць пра магчымасць Расіі развівацца цалкам самастойна. І пачалася рэалізацыя інтэграцыйных праектаў.

У сувязі з гэтым Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі з'яўляецца сапраўды важнай падзеяй у жыцці абодвух народаў. Беларусь змагла забяспечыць сябе неабходнымі прыроднымі рэсурсамі па прымальных цэнах, вярнуць для сваіх тавараў расійскі рынак збыту, часткова аднавіць ланцужкі вытворчай інтэграцыі і пачаць маштабнае аднаўленне сваёй эканомікі.

Расія вярнула сабе сапраўды надзейнага саюзніка для павелічэння ўплыву на міжнароднай арэне, выратавала ад краху сотні ўласных вытворчасцяў, якія пастаўлялі камплектныя часткі для прадпрыемстваў у Беларусі або гатовую прадукцыю на беларускі рынак. Таваразварот дзвюх краін дасягнуў у 2012 годзе грандыёзнай лічбы ў 44 мільярды долараў, і хутка будзе штурмаваць мяжу ў 50 мільярдаў.

Абедзве краіны істотна палепшылі сваю абараназдольнасць (асабліва ў сувязі з умовамі падпісанага 8 снежня 1999 г. у Маскве Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы). Дасягнуты сур'ёзныя поспехі ў ахове межаў і барацьбе са злачыннасцю.

Несумненныя і маштабныя выйгрышы абодвух бакоў у гуманітарным плане — грамадзяне дзвюх дзяржаў з кожным годам атрымліваюць усё больш падстаў адчуваць сябе ўтульна на тэрыторыі абедзвюх краін. Усё больш беларусаў прыязджае працаваць або вучыцца ў Расію, гэта таксама датычыцца і расіян у Беларусі. Беларуска-расійская інтэграцыя ў сувязі з відавочнымі поспехамі выглядае ўзорам і для еўразійскай інтэграцыі, якая рэалізуецца зараз.

Сяргей КІЗІМА,
загадчык кафедры
міжнародных адносін
Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце
Рэспублікі Беларусь,
доктар палітычных навук.

■ Інтэлектуальны марафон

«КАПЕЛЮШЫ» АД РАГАЧОЎСКАЙ ГІМНАЗІІ

Каля 150 юных даследчыкаў у розных галінах навукі з'ехаліся ў Рагачоў, каб паспрачацца за тры «капелюшы»: залаты, сярэбраны і бронзавы. Менавіта такія ўзнагароды чакалі пераможцаў адкрытага фестывалю «КалегіУМ-2013». Гімназія Рагачова пяты раз на вясенніх канікулах збірае школьнікаў не толькі Гомельскай вобласці. Сёлета былі прадстаўнікі нават расійскіх райцэнтраў Клімава і Кацельнікі.

Каб дзеці з розных гарадоў хутчэй адаптаваліся да ўмоў фестывалю, дарослыя стварылі для іх лабараторыю творчага майстэрства, мэтай якой было здружыць дзяцей. Дарэчы, арганізатары прапанавалі трактаваць тэкст вядомай казкі «Калабок» з пункту гледжання розных навуковых кірункаў: напрыклад, хіміі, англійскай мовы або права... І дзеці далі волю фантазіі. Яны параўноўвалі Калабка з аналагічным англійскім персанажам Джымі-пончыкам, вывучалі яго хімічны састаў пасля прагулкі па лесе і нават прыйшлі да высновы, што з пункту гледжання права толькі Ліса зрабіла добра, калі з'ела Калабка. Такім арыгінальным чынам, на погляд школьнікаў-філосафаў, яна абараніла яго ад негатыўнага ўплыву вуліцы. Чаго не зрабілі іншыя звяры ў лесе. Акрамя атмасферы агульнай весялосці, арганізатары змаглі дабіцца таго, што дзеці хутка перазнаёміліся, і працаваць разам далей ім было значна лягчэй.

Каб навукоўцы-пачаткоўцы адразу адчувалі вяршыню, да якой трэба імкнуцца, секцыі, у якіх яны прадстаўлялі свае работы, назвалі па імёнах вялікіх дзеячаў мінулага розных эпох: «Герадоты», «Эйнштэйны», «Ламаносавы», «Калумбы», «Шэкспіры» і «Пушкіны». Інтэлектуальны марафон доўжыўся тры дні пад кіраўніцтвам прафесіянальных навукоўцаў: выкладчыкі ГДУ імя Скарыны ўзялі будучых калег пад сваю апеку і судзілі іх строга, але справядліва.

Між тым, настаўнікі толькі здзіўляліся разнастайнасці інтарэсаў дзяцей. Кіраўнік секцыі «Герадоты» Таццяна Сталярова гаворыць, што дзеці прадставілі арыгінальныя краязнаўчыя даследаванні, напрыклад: «Гісторыя аднаго чалавека ў незвычайнай біяграфіі рудабельскай зямлі», «Званы гомельскіх праваслаўных храмаў у XX-XXI стагоддзях»:

— Гомельскі гімназіст Кірыл Сафонаў зацікавіўся надпісамі на званах. Ён гутарыў з манахамі, свяшчэннікамі, рабіў фота і відэаздымкі. Усё гэта ён прадставіў, калі прэзентаваў сваю работу. Дарэчы, 10-класнік заняў першае месца ў інтэлектуальным марафоне і ў конкурсе красамоўнасці. Самая юная ўдзельніца фестывалю — пяцікласніца нашай гімназіі Аксана Ганчарова — расказвала пра калыханкі. Яна прымусіла ўсіх не толькі ўспомніць, але і праспяваць іх разам. А Анастасія Падалякова з нашай гімназіі, якая ўрэшце атрымала «Сярэбраны капялюш», прадставіла цікавае даследаванне на тэму: «Я памятаю цудоўнае імгненне...», ці Як гэта гучыць на беларускай эстрадзе». Аказалася, дзеці добра разумеюць недасканаласць тэкстаў, якія гучаць са сцэны і экрана.

— Школьнікі, якія прадстаўлялі свае даследчыя работы на секцыі «Ламаносавы» — а гэта будучыя хімікі і біёлагі, — здзівілі ўсіх сваімі даследаваннямі, — расказвае Марыя Храмцова, выкладчык біялогіі Рагачоўскай гімназіі. — Прэзентавалі яны свае работы вельмі эмацыйна і маляўніча. Наша 8-класніца Даша Сарокіна даследавала магчымасці натуральных фарбавальнікаў. Дзяўчынка сама іх атрымлівала з раслін, афарбоўвала тканіны і расказвала, дзе можна прымяняць: пры вытворчасці адзення для дзяцей, для тых, хто церпіць ад алергічных захворванняў, у харчовай прамысловасці... А яшчэ прадэманстравала, як можна велікодныя яйкі пафарбаваць лісцем маладой бярозы, сокам шпінату, чырвонакачаннай капусты або маркоўным. Картузава Алеся абгрунтавана даказвала, што хатнія прадукты больш карысныя: яны змяшчаюць больш бялку, чым купленыя ў краме.

Абсалютным пераможцам і ўладальнікам «Залатога капелюша» стаў 10-класнік са Светлагорска Арцём Токачаў. Яго навуковая праца «Уплыў мінеральных угнаенняў на дынаміку нарастання зялёнай масы цыбулі, на колькасць і карэляцыю нітратаў і вітаміну С, у залежнасці ад дозы і віду мінеральных угнаенняў» уразіла ўсіх. Гэта, можна лічыць, інструкцыя для «прасунутага» фермера.

Дарэчы, пакуль дарослыя адзначалі практычную накіраванасць многіх работ юных даследчыкаў, яны самі спаборніцтва розумаў успрынялі як магчымасць займець новых сяброў. І цяпер у віртуальнай прасторы актыўна падтрымліваюць стасункі ў сацыяльных сетках. Нездарма мяняліся адрасамі, фота- і відэаздымкамі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ

Дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія г. Рагачова» Галіна РУБІСАВА:

— У нас згуртаваны калектыў. Сярод гімназій Гомельшчыны летась мы занялі першае месца па выніках ЦТ. З выпускнікоў толькі адзін вучань паступіў у сярэднюю спецыяльную ўстанову, а ўсе астатнія — у вышэйшыя. Вядома ж, для вучняў самае галоўнае — гэта асоба настаўніка, які вядзе іх за сабой і часта ўплывае на прафесійны выбар. І ў нас такія выкладчыкі ёсць: хімік Валянціна Рабіна і біёлаг Марыя Храмцова. Іх вучні на працягу многіх гадоў аддаюць перавагу медыцынскім ВНУ краіны. Пры тым, што гімназія шматпрофільная і нашы выпускнікі паступаюць у розныя вышэйшыя ўстановы: ёсць і лінгвісты, і тэхнары. Валерыя Лісейчыкава, шматразовая пераможца алімпіяд, зараз вучыцца на перакладчыка ў Беларускім лінгвістычным універсітэце. Лера Казлова і Дзіма Сіманаў абралі Інстытут журналістыкі БДУ. Мы актыўна ўдзельнічаем у алімпіядным руху. Заўсёды імкнёмся не толькі ствараць умовы для атрымання адукацыі, але і фарміраваць асобу, здольную быць карыснай сучаснаму грамадству. Асобна імкнёмся працаваць з адоранымі дзецьмі. У тым ліку для гэтага пяты раз праводзілі фестываль юных даследчыкаў «КалегіУМ». Члены вучнёўскага навуковага таварыства «Гімназічная акадэмія» паспяхова абараняюць свае навуковыя праекты на абласных і рэспубліканскіх навукова-практычных канферэнцыях. Штогод гімназіст бярэ ўдзел у сярэднім у 6-8 прадметных спаборніцтвах і конкурсах. У нас гэта завецца «школай алімпійскага рэзерву». Па колькасці пераможцаў і прызёраў алімпіяд навучальная ўстанова сярод лідараў абласнога рэйтынгу.

Гімназія Рагачова вядзе адлік сваёй гісторыі адразу з дзвюх дат: з 27 ліпеня 1999 года, калі на базе СШ № 1 была створана навучальная ўстанова новага тыпу, і з 1882 года, калі жыхарка Рагачова Марыя Анісімава адкрыла чатырохкласны прыватны пансіён. У 1906 годзе ён быў пераўтвораны ў жаночую прагімназію, у 1909 — у гімназію. Яе ўтрыманне ажыццяўлялася за кошт платы навучэнцаў, дапамогі з гарадскога і земскіх бюджэтаў і ахвяраванняў гараджан. У 1917 годзе ў Рагачоўскай гімназіі вучылася больш за 400 дзяўчат. Выпускніцы гімназіі атрымлівалі сярэднюю адукацыю, а тыя, хто скончыў дадатковы педагагічны клас, — права працаваць настаўніцай пачатковай школы. Да 1918 года гімназія з'яўлялася цэнтрам культурнага жыцця дарэвалюцыйнага горада.

Пераможцы «КалегіУМа» Арцём Токачаў, Настасся Падалякова і Эрык Міжэвіч.

■ Сацыяльнае партнёрства

КРОЧЫМ РАЗАМ. У НОВЫМ АБУТКУ

Дзве фуры абутку ад карпарацыі TOMS Shoes прыбылі на Гродзеншчыну для дзяцей-сірот, з інваліднасцю, з маламаёмных сем'яў і тых, хто знаходзіцца ў сацыяльна-небяспечным становішчы. У тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна г. Гродна адбылася прэзентацыя праекта «Крочым разам», які ажыццяўляецца вытворцамі абутку у партнёрстве з мясцовым сацыяльным фондам «Супрацоўніцтва для будучыні дзяцей» і прадстаўніцтвам Міжнароднага дзіцячага фонду ChildFund International ў Беларусі.

У амерыканскай карпарацыі TOMS Shoes ёсць такое правіла, так бы мовіць, сацыяльны стандарт: на адну пару абутку, што ідзе ў продаж, прыпадае пара, якая накіроўваецца на дабрачынныя мэты. З 2006 года кампанія падарыла дзецям, якія знаходзяцца ў складаным сацыяльным становішчы, каля двух мільёнаў пар абутку ў больш чым пяцідзесяці краінах.

Гэтыя тактыльна-моўныя навучальныя сістэмы ў рамках праекта набыты для кожнай абласной арганізацыі БелТІЗа. Пасля прэзентацый пройдзе вучоба інструктараў з рэгіёнаў, што працуюць з невідушчымі людзьмі. А затым у кожнай вобласці распрацуюць для пачатку па 10 найбольш важных маршрутаў з выкарыстаннем сістэмы прасторавага арыентавання, па якіх будуць навучацца ўсе ахвотныя інваліды па зроку. Гэтыя маршруты будуць раздрукаваны на пакуль адзіным у краіне «брайлеўскім» прынтары, які ёсць у цэнтральным праўленні БелТІЗа (сродкаў праекта на іх закупку для кожнай вобласці не хапіла) і прапануецца для патрэб кожнага рэгіёна.

Фотаздымкі Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

■ Наша спадчына

ГІСТОРЫІ КАХАННЯ І СМЕРЦІ

Столінскія бібліятэкары стварылі кнігу легендаў і паданняў аб назвах вёсак

Унікальная кніга «Адкуль у вёскі імя?» — сапраўдны рарытэт на Століншчыне. Бо, напрыклад, у райцэнтры ёсць усяго адзін яе экзэмпляр. Гэты не зусім звычайны зборнік стварылі людзі, якія цяпер ужо на заслужаным адпачынку. Насамрэч у кнігі цэлы калектыў аўтараў, да яе напісання ў свой час падключыліся амаль усе сельскія бібліятэкары раёна. Аўтар ідэі — тагачасны бібліятэкар Таццяна Савончык — згадвае: «Звесткі пра гісторыю ўзнікнення і назвы населеных пунктаў раёна захоўваліся ў розных крыніцах. Калі некаму з чытачоў для рэферата ці курсавой работы альбо супрацоўнікам для правядзення таго ці іншага мерапрыемства патрэбен быў матэрыял, даводзілася «пералапачваць» гару літаратуры. І ўсё роўна шмат што заставалася па-за кадрам альбо выклікала сумненні».

Яны ажывалі ў снах

— Было гэта дзясятак гадоў таму, — кажа Таццяна Аляксандраўна. — Загадчыцай у нас працавала Любоў Сімагасцікая. Мы з ёй і вырашылі прывесці ў сістэму тое, што было, а чаго не хапае, дапісаць. Папрасілі сельскіх бібліятэкараў абысці старажылаў, распытаць, запісаць іх успаміны. Калі распачыналі работу, не ўяўлялі сабе, як яна захопіць. Некаторыя населеныя пункты мелі ў паданнях некалькі варыянтаў паходжання назвы. Вырашылі запісваць усе. Потым былі доўгія дні і вечары апрацоўкі матэрыялу, пошукі новага, удакладненні, зверка з гістарычнымі крыніцамі.

Таццяна Савончык так захапілася новай працай, што гісторыі, асабліва трагічныя, страшныя, пачалі ёй сніцца па начах. «Калі б запісвала тое, што снілася, былі б гатовыя сцэнарыі дэтэктываў», — жартуе Таццяна Аляксандраўна.

Дакладна можна зняць фільм па легендзе пра вёску **Вялікі Лес**. Паданне расказалі старэйшыя людзі. У старадаўнія часы, кажуць яны, на гэтым месцы сапраўды быў вялікі густы лес. А за лесам — вялікае возера, паводле легенды — мора. Па гэтым моры на лодцы часта каталася каралева з маленькім сынам на руках. Але аднойчы наляцеў моцны вецер, і маці не ўтрымала сваё дзіця, яно выпала з рук, і яго паглынулі магутныя хвалі. Каралева вельмі засмуткавала. Сорак дзён яна не ела, не спала, толькі праклінала гэтыя мясціны. Потым безуцешная жанчына памерла. А праклён яе збыўся: і лес, і ўсё, што было навокал, правалілася ў багну, а потым паступова зацягнулася балотам. Хоць лесу ніякага няма побач, а вёску назвалі Вялікім Лесам у памяць аб тых далёкіх падзеях.

Сцэнарый для дэтэктыва

Стыне кроў у жылах ад паданння пра вёску **Сямігосцічы**. А так добра ўсё пачыналася... Жылі сабе побач сем сясцёр. І былі яны замужам за купцамі. Купцы часта адлучаліся з дому, ездзілі купляць тавар, гандляваць. Аднойчы, калі сёстры сумавалі ў адзіноце, завітаў да іх нейкі важны госць з дружынай сваёй. І такі ён быў прыгожы ды статны, што ўсе сёстры як адна закахаліся. Калі прыехалі дадому мужы, натуральна, паспрабавалі выгнаць чужынца, пачалася бойка. І ўсе сем купцоў загінулі. Пахавалі іх на ўзгорку, а вёску адразу назвалі Сямікосцічы, гэта значыць, сем касцей. Потым назва трансфармавалася ў Сямігосцічы, магчыма, не без уплыву памяці пра госця, які аказаўся жорсткім забойцам.

Лодка роспачы села на мель

У назвах некаторых вёсак увасобіліся гісторыі кахання, найбольш з трагічным фіналам. Пра вёску з назвай **Альгомель** кажуць наступнае. Даўным-даўно сяляне ўцякалі ад надта жорсткіх паноў і сяліліся ў такіх месцах, дзе б іх ніхто не мог знайсці. Тутэйшыя балоты спрыялі ўзнікненню падобных паселішчаў. У такой «нелегальнай» вёсцы з куранёў і зямлянак, акружанай з усіх бакоў амаль непраходнай дрыгвой, жыў статны юнак. А ў князя, чый замак стаяў недалёка ад Турава, была дачка-прыгажуня, звалася Вольгай. Аднойчы яны сустрэліся і закахаліся адно ў аднаго. Пачалі тайком сустракацца. Зусім як у вядомай песні «Каб даведаўся князь ды пра нашу любоў, то, напэўна б, нямала зляцела галоў». І князь усё ж даведаўся. Вольгу пасадзілі пад замок, а яе каханага было загадана злавіць і пакараць. Толькі хлопца княжацкім слугам высачыць не ўдалося, у паселішча сярод багны сунуцца яны пабаяліся. Князёўну неўзабаве выпусцілі з вязніцы. А ён кожны дзень хадзіў на бераг рэчкі, на месца былых сустрэч. Аднойчы юнак убачыў княжацкую лодку, а ў ёй знаёмую постаць. Але прычаліць да берага лодка не змагла, бо села на мель. Ён пачуў толькі голас аднаго з весляроў: «Вольга, мель!». Больш хлопец ніколі не пабачыў сваёй каханай. Ён вярнуўся дадому, паўтараючы два словы: «Вольга, мель». Сваякі і суседзі лічылі, што няшчасны ад кахання і роспачы страціў розум, бо ўвесь час вымаўляў толькі гэтыя словы, з імі і памёр. Адсюль і назва Альгомель...

Ямнае ад ямы, Столін ад стала

Гэта работа стала захапленнем бібліятэкара. Зараз Таццяна Савончык на пенсіі, але зусім нядаўна адрэдагавала гісторыю яшчэ адной назвы — **Ямнае**, і збіраецца перадаць яе ў бібліятэку. Гэта вёска асаблівая. У яе не легенда страшная, а сучаснасць трагічная. Ямнае трапіла ў зону адсялення пасля чарнобыльскай аварыі. Маладзейшыя тады з'ехалі, старэйшыя людзі засталіся. Некаторыя жывуць і цяпер. Назва ж пайшла ад ям — маленькіх азёр-сажалак, дзе першыя пасяленцы лавілі рыбу.

А тады ў кнігу ўвайшлі артыкулы пра назвы 78 населеных пунктаў раёна. Калі ўсе легенды былі сабраныя, апрацаваныя, а артыкулы размешчаны ў алфавітным парадку, матэрыял Таццяна Савончык надрукавала на машынцы ў пяці экземплярах. Чаму на машынцы? Таму што камп'ютара ў той час у бібліятэцы яшчэ не было. Потым лісты расклалі, пераплялі, атрымалася пяць кніжак. Тры раздалі бібліятэкам раёна, адну падарылі аддзелу краязнаўства абласной бібліятэкі, адну пакінулі сабе. Адна яна і ёсць у раённай бібліятэцы.

«Адкуль у вёскі імя?» чытаецца з цікавасцю з першых старонак. Бо ў кожным артыкуле — адна або некалькі легендаў, цытаты з летапісных ці іншых гістарычных крыніц. Ёсць на Століншчыне населеныя пункты, звязаныя з часам праўлення князя Ігара і княгіні Вольгі. Увазе чытача прапануюцца цікавыя версіі паходжання назвы райцэнтра. Паводле адной з іх, на месцы сённяшняга горада збіраліся знатныя людзі тутэйшага краю для абмеркавання надзённых праблем. А гаспадары шчодра накрывалі сталы. Адсюль **Столін**. Назва вёскі **Адвержычы** Манькавіцкага сельсавета таксама звязана з далёкай гісторыяй. Раней яна называлася інакш. У час мангола-татарскага нашэсця тут, на беразе ракі Гарынь, захопнікі былі спынены і адкінуты, «адвергнуты». І стала былое Загор'е Адвержычамі.

Французкі варыянт Альманаў

На Століншчыне наогул сустракаюцца вельмі каларытныя, нават незвычайныя назвы. А імя Вольга для многіх — знакавае. Альгомель мы ўжо згадвалі. Адзін з варыянтаў трактоўкі назвы **Альманы** мае амаль што анекдатычны характар. Расказваюць, што некалі застаўся-заблудзіўся ў палескіх мясцінах чужаземец. Магчыма, гэта быў француз пасля напалеонаўскай кампаніі. І вельмі ж ён быў ахвочы да цудоўнага полу. З усімі дзяўчатамі хацеў перазнаёміцца. Але што ні дзеўка ў акрузе — усё Воля альбо Маня. І ён вырашыў, што тут іншых імёнаў не бывае. Таму ён усіх клікаў — «Ольманя». Так пачаліся Альманы.

У паходжанні вёскі **Калонія** Гараднянскага сельсавета ніхто не сумняваецца. Мясцовы пан Васіль Шаўчэнка, родам з Івана-Франкоўскай вобласці, у свой час пераманіў людзей з Галіцыі. Паабяцаў, што яны будуць самастойнымі, бо тут вельмі ўрадлівыя землі, якія змогуць забяспечыць дабрабыт перасяленцам. Яны паслухаліся і перабраліся цэлай калоніяй. Але хутка збяднелі і вымушаны былі прасіцца на заробкі да пана. Суседзі і цяпер завуць іх «галіцыянамі».

Час заняцца новым выданнем

Многія легенды з кнігі не супадаюць з тымі звесткамі, якія ёсць у іншай літаратуры. Але бібліятэкары імкнуліся захаваць менавіта «народны» варыянт гісторыі, у тым яе і каштоўнасць. Паводле слоў Таццяны Савончык, аўтары не прэтэндавалі на паўнату і канчатковую ісціну. Яны хацелі ўнесці свой, хоць невялічкі, уклад у захаванне культурнай спадчыны роднага краю.

Цяперашні дырэктар Цэнтральнай раённай бібліятэчнай сістэмы Людміла Неўдах сказала, што кніга аказалася запатрабаванай. Яе бяруць настаўнікі для правядзення ўрокаў па краязнаўстве. Студэнты, якія вучацца ў брэсцкіх і мінскіх універсітэтах, пішуць рэфераты, курсавыя работы па гісторыі родных мясцін па матэрыялах кнігі «Адкуль у вёскі імя?». Таму, вядома, было б добра наладзіць перавыданне, набраць матэрыял на камп'ютары і нейкім чынам размножыць. Намеснік старшыні Столінскага райвыканкама Сяргей Сідарэвіч падчас гутаркі з карэспандэнтам «Звязды» падзякаваў за падказку і паабяцаў, што зойдзецца гэтым пытаннем. Грошы ж тут патрэбны невялікія.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Столінскі раён

■

Дырэктар раённай бібліятэкі Людміла Неўдах з кнігай.

КУЛЬТУРНЫ КРЭАТЫЎ

Капыльскі краязнаўчы музей радуе новымі праектамі

Сучаснага музейнага наведніка не здзівіш рознымі вечарынамі, прэзентацыямі, этнаграфічнымі святамі. Яго цікавасць трэба ўвесь час падтрымліваць. Супрацоўнікі Капыльскага краязнаўчага музея ў пастаянным пошуку новых формаў і метадаў работы з дзецьмі і дарослымі. І, як лічаць спецыялісты музейнай справы, яны выбралі правільны шлях, паколькі звычайныя экскурсіі і лекцыі практычна сябе зжылі.

Пра МАЗ і ананас

— Праектнай дзейнасцю з выкарыстаннем інтэрактыўных прыёмаў, гульняў мы пачалі займацца тры гады таму, — расказвае дырэктар музея Валянціна Шуракова. — Першы праект «Зялёны маршрут «Міжрэчча Мажы і Морачы» ажыццявілі ў рамках сумеснага праекта Еўрапейскага саюза і Праграмы ААН «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні». Праходзіць маршрут па вёсцы Семежава, заснаванай у XV стагоддзі Радзівіламі на былым Екацярынінскім тракце. Гэты населены пункт можна назваць музеем пад адкрытым небам, дзе ў адзінае цэлае аб'яднаны і архітэктура, і народныя бытавыя традыцыі, і мова, і культура, і экалогія.

Валянціна Шуракова з канструктарам Міхаілам Высоцкім.

Турыст, падарожнік можа тут выбраць тое, што яму больш імпануе, лягло на душу. Напрыклад, наведаць музей ткацтва і атрымаць майстар-клас. Дарэчы, толькі ў Семежаве прымянялася асаблівая тэхніка ткання чырвона-белых ручнікоў. Мястэчка славіцца і сваім абрадам «Калядныя цары», які ўвайшоў у Спіс нематэрыяльнай спадчыны ЮНЕСКА. Тут знаходзілася Пакроўская царква пачатку XVIII стагоддзя, сядзібна-паркавы комплекс Макраны, які належаў вядомаму роду Вайніловічаў. Магнаты калісьці нават вырошчвалі ананасы, якія экспартавалі за мяжу.

Менавіта ў гэтых мясцінах нарадзіўся Герой Беларусі, генеральны канструктар Мінскага аўтамабільнага завода Міхаіл Высоцкі. У музеі можна пачарпнуць шмат звестак пра айчыннае машынабудаванне, грамадскую, акадэмічную дзейнасць Міхаіла Сцяпанавіча.

— Калі адкрывалі музей, у яго была адзіная просьба: ніякай прэсы, — згадвае Валянціна Леанідаўна. — Гэты сціплы чалавек не хацеў, каб гаварылі, што ён пры жыцці стварыў сабе помнік. Хаця я заўсёды ўсім тлумачыла, што гэта музей не Высоцкаму. Гэта музей беларускай машыне. А дзякуючы працоўнай, навуковай працы Міхаіла Сцяпанавіча нашу краіну ведаюць ва ўсім свеце. Пры жыцці славутага земляка мы не паспелі зрабіць адну важную справу, а менавіта — паставіць «МАЗ» на радзіме канструктара. Але такая дамоўленасць з кіраўніцтвам завода ёсць. Вельмі хацелася б, каб нашы дзеці змаглі пасядзець за рулём волата, націснуць на педаль. Магчыма, у будучыні ў нас з'явіцца геніяльны паслядоўнік Высоцкага...

Пры рэалізацыі праекта з'явілася і яшчэ адна задума — па захаванні каларытнай, адметнай мовы семежаўцаў. Тут калісьці нават існаваў цэх жабракоў, дзе быў свой, нікому не зразумелы дыялект. Некаторыя слоўцы захаваліся ў мястэчку і да гэтага часу. «Чаму б не прапанаваць унесці мову ў спіс нематэрыяльнай спадчыны?» — лічыць дырэктар музея.

У Семежаве распрацаваны і экалагічныя сцежкі, маршруты для веласіпедных прагулак уздоўж канала. Тым часам аматары рыбалкі могуць пасядзець з вудай, а прыхільнікі прыроды — азнаёміцца з рэдкімі відамі звяроў і птушак, якія занесены ў Чырвоную кнігу.

— Дарэчы, зялёныя маршруты даволі распаўсюджаны ў Еўропе. Гэта турыстычныя шляхі, якія праходзяць каля прыродных, гістарычных або іншых славутасцяў (напрыклад, рэкі, традыцыйныя гандлёвыя шляхі, прывабныя ландшафты і інш.). Па іх можна падарожнічаць рознымі спосабамі: на веласіпедах, лодках, конях, а зімой на лыжах і санях, — тлумачыць Валянціна Шуракова. — Такія маршруты найлепш прапагандуюць здаровы лад жыцця, робяць больш прывабным уязны турызм.

Ведай нашых!

Ураджэнцы Капыльшчыны, якія з'ехалі за мяжу, унеслі значны ўклад у развіццё сусветнай культуры. Пра гэта стала вядома пры рэалізацыі сумеснага праекта з прадстаўніцтвам зарэгістраванага германскага таварыства Deutscher Volkshochschul-Verband e.V.

— Гэтая старонка Капыльшчыны была малавядомая, а дзякуючы праекту сёння прадстаўлена ў экспазіцыі музея, — канстатуе Валянціна Шуракова. — На пачатку XX стагоддзя многія жыхары нашага краю эмігравалі ў краіны Заходняй Еўропы, ЗША. Некаторыя з іх вярнуліся назад, як, напрыклад, сям'я Пылілa з вёскі Вялешына. Іншыя прыжыліся на чужыне, пусцілі карані. Для нас, беларусаў, доўгі час былі невядомыя імёны славутых землякоў. Марвін Духаў — кампазітар. Соф'я Тшашчкоўская — паэтэса, Міхаліна Даманская — пісьменніца. Казімір Петрусевіч — дэлегат І з'езда РСДРП, вядомы адвакат. Ён абараняў Янку Купалу, Якуба Коласа, Максіма Танка, потым працаваў суддзёй Вярхоўнага суда Польскай Народнай Рэспублікі.

У выніку праекта сталі вядомыя не толькі імёны і лёс кожнага з эмігрантаў, але і сабраны новыя артэфакты, фотаздымкі, кнігі, дакументы. Як вынік, наладжана перасоўная выстава і выдадзены буклет. Супрацоўнікі музея наведалі з экспазіцыяй самыя аддаленыя куткі раёна. Для гэтага была магчымасць, паколькі дзякуючы праекту ўдалося набыць трансформеры для перасоўнай выставы.

«Трэцяе пакаленне» апякуецца пра шчасце

«Трэцім пакаленнем» цяпер называюць маладых пенсіянераў: мужчын пасля 60-ці гадоў і жанчын пасля 55-ці. На жаль, многія з іх засталіся па-за справамі.

— Гэта ненармальна, — лічыць Валянціна Шуракова. — У іх вялікі вопыт, жыццёвы патэнцыял. А самае галоўнае, яны выхавалі дзяцей, маюць шмат вольнага часу, каб аддаваць яго рабоце. Такіх людзей проста нельга страціць. І мы зрабілі для іх яшчэ адзін праект — «Апекуны шчасця». Для яго ажыццяўлення ў нас была база. Справа ў тым, што на працягу пяці гадоў у музеі праходзіць адукацыйнае мерапрыемства «Роля прадметаў побыту і этнаграфіі ў правядзенні беларускага нацыянальнага вяселля», існуючая экспазіцыя як бы створана пад яго.

Маладыя, што бяруцца шлюбам, цалкам праходзяць вясельны абрад сваіх продкаў. Яны пакідаюць музей з мноствам падарункаў: велізарным пшанічным караваем на індывідуальны заказ. Ім уручаюць кнігу «Памяць» Капыльскага раёна, каб яны, іх дзеці залатымі літарамі ўпісалі ў агульную гісторыю сваёй зямлі асабістыя здабыткі. Новаспечаныя сужэнцы атрымліваюць ляльку-куватку. Гэтая лялька-неразлучніца звязвае жонку і мужа ў адно цэлае. Акрамя таго, ім дораць куфэрак — прататып таго куфра, дзе захоўвалі пасаг нашы бабулі. А выраблюць усе гэтыя сімвалы ўручную менавіта пенсіянеры, ці, як іх называе Валянціна Шуракова, сеньёры. Усе госці вяселля атрымліваюць вялікую імянную грамату, зробленую супрацоўнікамі музея, па якой іх дзеці могуць наведваць музей бясплатна. Гэты праект мае на мэце пераемнасць пакаленняў: малодшага (дзяцей, унукаў), сярэдняга (бацькоў) і старэйшага (бабуль і дзядуляў). Дзякуючы праекту з'явілася кніга «Апекуны шчасця», фільм «Калядныя сямейна-бытавыя абрады».

Прыватная калекцыя яднае

На пачатку гэтага года музей распачаў новы праект «Выставе з прыватных калекцый». Удзел у ім можа прыняць любы грамадзянін, якому ёсць што паказаць землякам і чым падзяліцца. Напрыклад, гэта могуць быць рэдкія значкі, манеты, паштоўкі, цацкі, прадметы побыту. «Першай ластаўкай стала выстава «Лялькі з усяго свету».

— Уладальніца калекцыі — сястра нашай супрацоўніцы Аляксандра Мотуз, — распавяла Валянціна Леанідаўна. — Асабліва даспадобы выстава прыйшлася дзецям. Яны на карце шукалі, адкуль кожная лялька, вывучалі нацыянальныя строі розных краін. Для іх было заданне знайсці і намаляваць нашу беларускую ляльку, якая стаяла асобна. Затым дзеці выходзілі на вуліцу і запускалі ў паветра шары, у кожным з якіх было запрашэнне бясплатна наведаць выставу.

Зараз у музеі дэманструецца прыватная калекцыя загадчыка раённай стаматалогіі Уладзіміра Дварэцкага. Гэта 79 унікальных паштовак пачатку XX стагоддзя з вядомых друкарняў Санкт-Пецярбурга, Францыі і 10 паштовак Маскоўскага выдавецтва «Мультыплікатар». Такіх няма нават у вядомых калекцыянераў. Экспазіцыю супрацоўнікі музея дапоўнілі калекцыяй алавяных салдацікаў з фондаў музея, што дазволіла зацікавіць дзяцей.

А нядаўна на Капыльшчыне закончыўся тыдзень духоўнасці. Як працяг, у музеі плануецца выстава абразоў Ядзвігі Сянько з Маладзечна, якія блаславіў Мітрапаліт Філарэт. Дапоўніць экспазіцыю паштоўкі 30-х гадоў жыхаркі вёскі Семежава на рэлігійныя тэмы.

Такі праект — добрая магчымасць для капылян азнаёміцца з творчасцю, захапленнямі і ўнутраным светам сваіх землякоў.

Фігурка сабачкі з гліны перыяду жалезнага веку

«Мы — маленькі музей»

Капыльскі краязнаўчы музей першым сярод раённых музеяў у 2000 годзе атрымаў грант Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на стварэнне музейнай экспазіцыі. Установа двойчы перамагала ў намінацыі Мінаблвыканкама «Музейная справа» — у 2004 і 2009 гадах, а таксама ў намінацыі «Лепшы музей года». Чатыры гады таму калектыў вылучалі на атрыманне прэміі Прэзідэнта Беларусі «За духоўнае адраджэнне». Узнагароду атрымаў музей Веткі. Тым не менш факт яскрава сведчыць пра заслугі капылян. У 2011 годзе дырэктар музея Валянціна Шуракова ўзнагароджана значкам Міністэрства культуры «За асабісты ўклад у развіццё культуры Рэспублікі Беларусь», у 2013-м — ганаровай граматай аблвыканкама.

— Гэта вынік работы нашага невялікага калектыву. Мне пашанцавала працаваць з такімі спецыялістамі, як Таццяна Варанцова і Андрэй Лятчэня, генератарамі ідэй. Мы маленькі музей, але ў нас ёсць свае перамогі, — сказала Валянціна Леанідаўна.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ,
Капыльскі раён.

Дырэктар раённай бібліятэкі Людміла Неўдах з кнігай.

Аленям патрэбна цішыня

Зонай абсалютнай цішыні аб'яўлены ўчастак лесу ў Пінскім лясгасе, дзе ўзведзены вальер для высакародных аленяў.

Развядзенне гэтых прыгожых жывёл на Піншчыне стала часткай праграмы развіцця Прыпяцкага Палесся. Раней тут высакародных аленяў ніколі не было.

Навасёлаў 12-гектарнага вальера прывезлі з Белавежскай пушчы. Імі сталі дзве самкі. Набыты таксама самец, але ён яшчэ гуляе па пушчы. Яго неўзабаве вылавяць і прывязуць на Піншчыну.

Алені будуць знаходзіцца ў вальеры год, потым іх выпусцяць на волю. За год жывёла павінна адаптавацца да новых умоў. На гэты час паблізу забаронена ўсялякая лесагаспадарчая дзейнасць, тым больш паляванне.

Яна СВЕТАВА.

Ігуменскі тракт

№ 6 (21)

■ Выстава

НАБЫТАК МІНСКАГА ДЫПЛАМАТА

Калекцыянер 5 гадоў купляў гравюры паўстання 1863-1864 гг.

Гэтую выставу нельга аднесці да разраду звычайных. У Нацыянальным гістарычным музеі зараз экспануецца прыватная калекцыя гравюр паўстання 1863-1864 гадоў з французскага часопіса «Le Monde illustre».

Як слушна заўважыў дырэктар музея Алег Рыжкоў, на выставе не гаворыцца, што гэта было і як, — тут проста канстатуецца гістарычны факт. Наведвальнікі могуць самі ўзгадаць пра тыя падзеі і даць ім уласную ацэнку.

Калекцыянер, які прадаставіў усе гэтыя гравюры, прысутнічаў на адкрыцці выставы, аднак вырашыў застацца інкогніта. Вядома толькі, што сам ён дыпламат, жыве ў Мінску. Ён папрасіў не называць яго прозвішча («проста Андрэй, гэтага дастаткова») і распавёў карэспандэнту «Звязды», як яму ўдалося сабраць гэтую ўнікальную калекцыю:

— Як дыпламату, мне пастаянна даводзіцца ездзіць за мяжу. І калі я дзесьці бываю, то заўсёды шукаю нешта такое, што датычыцца гісторыі Беларусі. Аднойчы мне трапіла адна гравюра, якая моцна прыцягнула маю ўвагу, і я падумаў: «Ой, гэта ж цікава! Гэта ж якраз у нас адбывалася!» Я тады яе і купіў. Потым трапілася другая, трэцяя, чацвёртая — і я сказаў сабе «хопіць», бо гэта зусім не танная справа — трымаць такія гравюры. Аднак спыніцца на гэтым я не змог, зноў пачаў купляць. Усяго выйшла каля 40 работ, на выставе прадстаўлены 34. Збіраў калекцыю я 5 гадоў. Усе гравюры з французскага часопіса «Le Monde illustre» — яго зараз ужо няма. Так сталася, што часопісы з гравюрамі захоўваліся не толькі ў Францыі — яны трапілі і ў іншыя краіны. Таму некаторыя працы я набываў у Германіі, Швейцарыі, Італіі, Грэцыі, на Кіпры — геаграфія вельмі шырокая.

Андрэй адзначыў, што іншых калекцый у яго няма. Яго цікавіць менавіта гэтая тэма. Калекцыя будзе экспанавацца і ў іншых гарадах — наступным, верагодна, стане Гомель. Калі будуць зацікаўлены Польшча, Літва, заўважыў калекцыянер, выстава можа паехаць і ў Вільню, і ў Варшаву.

ЧАМУ ФРАНЦУЗСКІ ЧАСОПІС ЦІКАВІЎСЯ НАШЫМ ПАЎСТАННЕМ?

Асабіста мяне сам факт адлюстравання паўстання ў гравюрах, ды яшчэ ў французскім часопісе, вельмі зацікавіў. Няпроста, відаць, было аўтарам работ і пазмагацца паспець, і гравюру вырабіць, яшчэ і пасласць у замежны часопіс. Ды і чаму еўрапейскае выданне так цікавілася нашым паўстаннем? Відаць, нездарма адзначаецца, што гэтае паўстанне на частцы тэрыторыі колішняй Рэчы Паспалітай паспрыяла ажыўленню грамадска-палітычных сіл, рэвалюцыйнага руху ў Еўропе. Пракаментаваць саму з'яву гэтых гравюр я папрасіла мастацтвазнаўцу Сяргея Харэўскага:

— У тую эпоху фатаграфія рабіла толькі першыя крокі. Таму для часопісаў, газет ствараліся вось такія рэпартажныя малюнкі з месцаў падзей. Прафесійным мастакам даваліся замовы, і яны іх выконвалі. Сярод удзельнікаў паўстання было шмат мастакоў. Таму гравюры спачатку рабілася непасрэдна ўдзельнікамі паўстання. Сёння для нас гэта проста прыгожыя малюнкі, а тады яны ўспрымаліся як плакаты, як важная візуальная інфармацыя, дакумент. Таму да гэтага трэба ставіцца не проста як да мастацтва, а як да вельмі важнага гістарычнага сведчання. Сапраўды, гэта быў працаёмкі працэс. На выставе ёсць розныя віды гравюр — па метале, літаграфіі, гравюры па камені. А дзякуючы таму, што ў Францыі быў належны паліграфічны ўзровень, мы сёння маем выдатныя творы. Таму трэба аддаць даніну і прафесійнаму ўзроўню мастакоў, і рэпарцёрскаму складніку — усё ж гэта замаўлялі рэдактары. Трэба разумець, што гэта не проста парыў душы, хоць бывала і такое.

Сяргей Харэўскі назваў і імёны мастакоў, якія прымалі ўдзел у паўстанні. Сярод іншых ёсць і імя Генры Сандэрса — гэта псеўданім Генрыха Дмахоўскага, славутага беларускага скульптара, пачынальніка амерыканскай школы скульптуры. Дазнаўшыся пра пачатак паўстання, ён прыехаў у родны край, на свае грошы сабраў атрад, быў адным з кіраўнікоў паўстання і загінуў ад кулі ворага. Сярод мастакоў быў і Міхал Эльвіра Андрыёлі, удзельнік паўстання, асабісты сябар Кастуся Каліноўскага, мастак-графік, які ўжо падчас эміграцыі, у Парыжы, зрабіў вялікую серыю літаграфій. Артур Гротгер, сам родам са Львова. Па матывах тагачасных падзей у яго ёсць серыя гравюр і карцін. Наш выдатны мастак Казімір Альхімовіч таксама быў удзельнікам паўстання. Яго саслалі ў Сібір, і там ён адзначыўся як першы настаўнік мастакоў братоў Васняцовых, якія сталі славутымі расійскімі мастакамі. Па вяртанні на радзіму Альхімовіч стварыў сваю серыю гравюр.

Княжна Б... перадае штандар камандзіру добраахвотнікаў Арленскаму. Мінская губерня (паводле эскіза М. Каралі)

ДАКУМЕНТЫ — У АДКРЫТЫМ КАРЫСТАННІ

Можна меркаваць, што пасля з'яўлення выставы гэтая раней мала даследаваная тэма атрымае новы віток развіцця. Так сцвярджалі і прадстаўнікі розных архіваў, што прысутнічалі на адкрыцці. Напрыклад, вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі Дзмітрый Матвейчык паведаміў, што архіў захоўвае вялікую колькасць матэрыялаў, якія адлюстроўваюць розныя бакі развіцця і падаўлення паўстання 1863-1864 гадоў на тэрыторыі як Беларусі, так і сумежных краін. Матвейчык адзначыў, што паўстанне дагэтуль з'яўляецца недастаткова даследаваным, і таму кожнаму гісторыку ёсць дзе папоўніць свае веды і падзяліцца гэтымі ведамі з іншымі.

З той жа прапановай выступаў і Дырэктар Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Беларусі Уладзімір Адамушка. Ён расказаў, што ў Нацыянальных гістарычных архівах у Мінску і ў Гродне, Беларускім архіве-музеі літаратуры і мастацтва — захоўваюцца дакументы, якія асвятляюць гэтую падзею. Адамушка запрасіў усіх ахвотных да распрацоўкі тэмы паўстання — усе дакументы знаходзяцца ў адкрытым доступе.

Атрад добраахвотнікаў пакідае Гродна, каб злучыцца з арміяй паўстанцаў (паводле эскіза М.К.), 1863-1864 гг.

«АЎТОГРАФЫ ПАЎСТАНЦАЎ», АБО ЛЁС КАГАНЦА

Акрамя гравюр, на выставе экспануюцца і дакументы з Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва. Пра іх дзіўны лёс і сувязь з родам пісьменніка Каруся Каганца распавяла дырэктар установы Ганна Запартыка:

— Сярод дакументаў нашага архіва выяўлена шмат унікальных рукапісаў часоў паўстання. Перш за ўсё гэта звязана з фондам беларускага мастака, пісьменніка, грамадскага дзеяча Казіміра Кастравіцкага (Каруся Каганца). Яго сям'я спрычынілася да паўстання самым актыўным чынам і трагічна несла, разам з многімі паўстанцамі, свой крыж, спазнаўшы, што такое арышт і высылка ў далёкія губерні Расіі. Толькі аднаму прадстаўніку сям'і — стрыечнаму брату Карла Кастравіцкага (бацькі Каруся Каганца) — удалося эмігрыраваць у Еўропу. Менавіта з гэтай галіны роду паходзіць знакаміты французскі паэт Гіём Апалінэр — яны вельмі блізкія сваякі. Што тычыцца сям'і Карла Кастравіцкага, ён быў высланы ў Табольск разам з жонкай і двума дзецьмі. Там і нарадзіўся Карусь. Праз нейкі час сям'я вярнулася на радзіму. З тых далёкіх часоў і тых трагічных шляхоў засталіся ўнікальныя дакументы, якія ў пачатку 1990-х трапілі з Масквы ў Беларусь ад дачкі Каруся Каганца Галіны Куцяты — жанчыны ўжо ў шаноўным узросце. Зараз гэтыя дакументы складаюць асаблівую каштоўнасць нашага архіва. Гэта (як мы іх назвалі ў свой час) «развітальныя аўтографы паўстанцаў», якія былі арыштаваны на тэрыторыі Мінскай губерні і чакалі прысуду ў сутарэннях кляштара Бернардзінцаў — таго самага кляштара, які зараз рэстаўруецца. У яго касцельным будынку цяпер і знаходзіцца Беларускі архіў-музей літаратуры і мастацтва. У гэтым ёсць нешта містычнае: мы толькі туды пераехалі, як адразу да нас трапіў невялічкі фонд, сярод якога былі і гэтыя развітальныя аўтографы.

Сярод іншых дакументаў Ганна Запартыка назвала летапіс Дукорскай царквы, у якім таксама ёсць старонкі, прысвечаныя паўстанню. Захоўваецца шмат твораў, запісаных ужо ў больш позні час. Ёсць аўтограф Антона Луцкевіча, які датуецца пачаткам XX стагоддзя, і многае іншае.

На адкрыцці выставы зала Нацыянальнага гістарычнага музея ў беларускай сталіцы была перапоўнена. Сапраўды, выстава знакавая ў любым сэнсе. Па-першае, ёй было яшчэ раз адзначана 150-годдзе паўстання — а гэта вялікая падзея для гісторыі беларускай дзяржаўнасці. Бо паўстанне 1863-1864 гг. засведчыла, што на нашай зямлі павінна быць асобная дзяржава і грамадзяне гэтай краіны гатовы шмат чым ахвяраваць, каб сталася так.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

■ Народныя мудраслоўі

«ДАРУ МЕДЗІ, КАБ ДЗЕЦІ БЫЛІ, ЯК МЯДЗВЕДЗІ»,

АБО ГРОШЫ Ў ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ ЎСХОДНІХ СЛАВЯН

Грошы ва ўсе часы існавання чалавецтва выклікалі велізарную цікавасць. Яны выступалі знакам багацця, служылі прадметам абмену, выкупу або проста падарунка. У той жа час у народным асяроддзі да грошай было даволі стрыманае стаўленне. Паводле аднаго з «залатых» правілаў народнай культуры, нельга падбіраць грошы на скрыжаванні дарог, бо менавіта так «адкупляюцца» ад хвароб і бед.

Некалі існавала цікавае вераванне славянскіх народаў пра неразменны рубель, які валодае здольнасцю вяртацца ў кішэню свайго ўладальніка і які марыў мець кожны.

У дачыненні да грошай былі сфарміраваны даволі шматлікія рэгламентацыі. Нашы продкі верылі ў тое, што, парушаючы вызначаныя забароны і абмежаванні, можна назаўжды «страціць» поспех (або, як казалі ў старажытнасці, «спор»), і дабрабыт сям'і пойдзе на змяншэнне. Напрыклад, забаранялася рабіць грашовыя разлікі пасля заходу сонца, у панядзелак і вялікія гадавыя святы; каб не жыць у галечы, забаранялася даваць міласціну тымі грашыма, якія атрымалі на рэшту ад куплі хлеба або солі; забаранялася гаварыць, што ў хаце зусім няма грошай, нават калі іх і сапраўды вельмі мала, бо лічылі, што грошы «пакрыўдзяцца» і пакінуць хату назаўсёды.

Мудрыя людзі давалі параду: каб грошы не пераводзіліся, неабходна выпрацаваць у сябе звычку аддаваць левай рукой, а браць — правай, бо казалі: *«Грошы круглыя, таму і коткія»*.

Даволі часта грошы (а дакладней, манеты) выступалі як адзін з рытуальных прадметаў у сямейна-радавой і каляндарнай абраднасці ўсходніх славян. Напрыклад, каб быць з «чыстым» тварам, на Вялікдзень мыліся «праз срэбра», г.зн. у ваду клалі сярэбраную манету. На Каляды калядоўшчыкам, на Вялікдзень валачобнікам за выкананне калядных і валачобных песень-віншаванняў абавязкова давалі некалькі манет. Манеты выкарыстоўвалі падчас Калядных варожбаў: запякалі ў хлебе, клалі ў гаршчок з кашай, пад падушку, у крынічную ваду. Ва ўсіх сітуацыях той, хто станавіўся ўладальнікам гэтай незвычайнай манеты, лічыўся ўдачлівым: на працягу года яго мары абавязкова павінны спраўдзіцца.

Грошы былі абавязковым складнікам падчас сватаўства і самога вяселля (на змовінах і заручынах, калі выкупалі нявесту, у час вянчання), у тым ліку і вясельным падарункам. Ва ўсіх сітуацыях грошы сімвалізавалі багатае жыццё шлюбнай пары. Часцей за ўсё ў абрадавых дзеяннях «удзельнічалі» манеты, вырабленыя з металу, уласцівасці якога звязвалі з шэрагам сацыяльных якасцяў або каштоўнасцяў. Напрыклад, медныя і сярэбраныя манеты расцэньвалі як прыкмету здароўя: *«Дару медзі, каб дзеці былі як мядзведзі»*, багацця і дабрабыту: *«Дару меднымі, каб не былі беднымі»*, *«Вось табе серабро, каб мець дабро. Вось табе медзь, каб дзяцей мець»*.

Разам з тым, існаваў шэраг забарон і абмежаванняў, якія датычыліся менавіта грошай, якімі адорвалі маладых. На Віцебшчыне існаваў звычай, згодна з якім пасля заканчэння дарэння шаферкі лічылі грошы, колькасць якіх павінна была быць цотнай, каб маладыя да глыбокай старасці жылі «ў пары», астатнія дробныя грошы раскідвалі дзецям. На Міншчыне да грошай, якія дарылі маладым, таксама падыходзілі вельмі строга. Па-першае, іх нельга аддаваць у рукі маладым (гэтае сімвалічнае прадпісанне існуе і цяпер), таму побач з маладымі ставілі талерку, якую засцілалі спецыяльна вытканым для гэтага выпадку невялікім ручніком (пазней — ільняной хусткай). І той, хто адорваў маладых грашамі, павінен быў пакласці туды манеты, а пазней — купюры. Па-другое, пасля таго, як адорванне маладых заканчвалася, грошы тут жа звязвалі або загортвалі ў гэты ручнік і ўсаджвалі на «скарб» самую старэйшую жанчыну ў сям'і (прычым, ручнік ці хустку абавязкова пераварочвалі вузламі ўніз).

Манеты выкарыстоўваліся і ў радзінных абрадах. Пасля прыняцця родаў бабка-павітуха павінна была мыць рукі над карытам, у якое бацька дзіцяці або блізкі сваяк кінуў манетку. Пры першым наведванні парадзіхі і немаўляці жанчына павінна была прынесці ў хату палатна на «пялёнкі» і некалькі манет. Пры першым рытуальным купанні дзіцяці ў ночвы клалі медную ці сярэбраную манету, клапоцячыся пра яго дабрабыт і здароўе.

Манеты станавіліся абавязковым атрыбутам падчас пахаванняў. Калі нябожчык «расплюшчваў вочы», яму на павекі клалі манеты. Сваякі першай і другой ступені сваяцтва кідалі манеты ў магілу, часам клалі ў труну, «выкупляючы» пераправу на «той» свет.

Без грошай не абыходзілася будаўніцтва хаты і яе «засваенне». Так, у падмурак абавязкова «закладвалі» адну-дзве манеты і прыгаворвалі: *«Каціся ў кут серабро, у хату на дабро»*. А падчас уваходзін, ведаючы, што новая пабудова, паводле вераванняў продкаў, запатрабуе «ахвяру», разам са збожжам на падлогу кідалі і некалькі манет. Пры гэтым казалі так: *«Выкупляю хату не людзямі, а грашамі»*.

Існавала нямала спосабаў, якія, па меркаванні продкаў, дапамагаюць прымножыць «багацце». Здаўна вядомы звычай — кідаць грошы ў крыніцу і каля культавых збудаванняў (капліц, крыжоў, храмаў, манастыроў) у надзеі на паляпшэнне свайго дабрабыту.

Каб павялічыць свой дабрабыт, неабходна было, убачыўшы справа ад сябе малады Месяц, паказаць яму манету. Для гэтага ж, пачуўшы ўпершыню ўвесну зязюлю, патрэсці дробяззю (г.зн. манетамі) у кішэні. *«Грошы лік любяць»* — і таму раілі пералічваць усе наяўныя грошы на Каляды або Вялікдзень, а падчас святочных службаў у храме абавязкова трымаць у кішэні трохі грошай.

Народныя знахары і сёння раяць прымножыць сваё багацце ці «выправіць» дрэннае фінансавае становішча так: напярэдадні Раства Хрыстовага або Вялікадня ахвяраваць нягай нават самую малую суму грошай на будаўніцтва царквы; пасадзіць за адзін дзень 7 дрэў, кажучы пры гэтым: «Вам расці, мне ў багацці цвісці».

Існавала і нямала прымет, звязаных з грашыма. Манета, знойдзеная на дарозе, прадвяшчала змены: павелічэнне дабрабыту — калі ляжала «арлом» угару, няўдачы — калі «рэшкай». Калі сярод іншых манет траплялася вышчарбленая, гнутая, гэта абяцала прыбытак, таму яе адкладвалі і насілі ў кашальку як талісман, знак поспеху. Такое ж стаўленне было і да манеты з дзірачкай.

Адным словам, як у беларускай прыказцы: ***«Без нуды пражывеш, калі грошай нажывеш!»***

Аксана КАТОВІЧ.
Янка КРУК.

■ 100 славутых прозвішчаў Беларусі

ОРДЫ

Прозвішча Орда ў беларусаў у першую чаргу асацыіруецца з прозвішчам неардынарнай асобы, чалавека, які займае адно з першых месцаў сярод выдатных дзеячаў беларускай культуры, — Напалеона Орды. Напалеон Орда быў надзвычай таленавітым чалавекам: у яго асобе арганічна спалучалася некалькі талентаў: мастак, музыкант, кампазітар, пісьменнік, педагог, архітэктар, публіцыст, вучоны.

НАПАЛЕОН ОРДА — ЧАЛАВЕК З НЕЗВЫЧАЙНАЙ БІЯГРАФІЯЙ

Жыццё і творчасць Напалеона Орды непарыўна былі звязаны з Беларуссю. Нарадзіўся будучы мастак у вёсцы Варацэвічы Пінскага павета Мінскай губерні (цяпер — Іванаўскі раён Брэсцкай вобласці) у сям'і кобрынскага маршалка, інжынера-фартыфікатара. Бацькі не стала, калі Напалеону было два гады. Выхоўвала будучага мастака маці — Юзэфа Бутрымовіч, дачка пінскага старасты. Пачатковую адукацыю юнак атрымаў у бацькоўскім доме, затым прадоўжыў навучанне ў знакамітай Свіслацкай гімназіі. У 1823 годзе паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Віленскага ўніверсітэта. Але закончыць вышэйшую навучальную ўстанову не давялося. Падчас вучобы Напалеон стаў членам тайнага студэнцкага таварыства «Заране». За ўдзел у гэтым таварыстве ён быў выключаны з 4-га курса ўніверсітэта і арыштаваны. Разам з Ордам з універсітэта былі адлічаны і іншыя знакамітыя асобы беларуска-польскай гісторыі: Адам Міцкевіч, Ігнат Дамейка, Ян Чачот. Амаль 15 месяцаў Напалеон Орда правёў у Віленскай турме. Пасля вызвалення вярнуўся ў родную вёску, дзе знаходзіўся пад наглядам паліцыі. У 1830 — 1831 гг. адбылося нацыянальна-вызваленчае паўстанне за аднаўленне Рэчы Паспалітай, у якім Напалеон Орда прыняў актыўны ўдзел: камандаваў партызанскім атрадам, з'яўляўся стралком коннай гвардыі Літоўскага корпуса ў Польшчы. Асабліва вызначыўся Напалеон Орда ў бітве пад Коцкам, за што атрымаў вышэйшую ўзнагароду — ордэн Залатога крыжа (*Virtuti Militari*) і чын капітана паўстанцкай арміі. Расійскімі ўладамі Орда за ўдзел у паўстанні быў далучаны да ліку мяцежнікаў і падлягаў ссылцы ў Сібір. Аднак Напалеону ўдалося пад чужым іменем эмігрыраваць у Еўропу. Жыў у Аўстрыі, Швейцарыі, Італіі, Францыі. У 1833 годзе Напалеон Орда атрымаў статус эмігранта і застаўся ў Францыі.Там ён пазнаёміўся з многімі знакамітымі дзеячамі еўрапейскай культуры: Ф. Шапэнам, Ф. Лістам, Дж. Расіні, Дж. Вердзі, Ж. Гуно, Г. Берліёзам, А. Бальзакам, А. Стэндалем, П. Віярдо, І. Тургеневым. Паводле сведчанняў гісторыкаў, за мяжой Напалеон Орда разам з Фрэдэрыкам Шапэнам музыцыраваў на вечарах у доме Чартарыйскіх, суправаджаў ігрой на фартэпіяна паэтычныя імправізацыі Адама Міцкевіча. Талент музыканта і кампазітара быў заўважаны: Напалеону Орду прызначылі на пасаду дырэктара Італьянскай оперы ў Парыжы. У 1843 годзе мастак ажаніўся з французанкай Ірэнэ Багле. У 1856 годзе пасля аб'яўлення расійскім імператарам Аляксандрам II амністыі эмігрантам Напалеон Орда пакінуў сям'ю, забяспечанае жыццё і паспяховую кар'еру і вярнуўся на радзіму. Пасля смерці маці радавы маёнтак у Варацэвічах быў канфіскаваны. Прычынай паслужыў удзел Н. Орды ў паўстанні. Адзінае, што дазволілі ўлады мастаку, — узяць маёнтак у арэнду. Пазней мастак пэўны час (1862 — 1863 гг.) жыў у Гродне, затым пераехаў на Валынь, дзе працаваў хатнім настаўнікам музыкі.

У 1866 годзе мастак зноў быў арыштаваны па падазрэнні ва ўдзеле ў нацыянальна-вызваленчым паўстанні 1863-1864 гг. і пасаджаны ў Кобрынскі турэмны замак. У 1867 годзе ваенна-палявы суд прыгаварыў Орду да высылкі ў аддаленыя губерні Расіі. Аднак дзякуючы намаганням жонкі і пасла Францыі прыгавор адмянілі. Улады пазбавілі мастака права арэнды і пражывання ў радавым маёнтку. Напалеон вымушаны быў пасяліцца ў сваякоў — у сваёй сястры, памешчыцы Гартэнзіі Скірмунт у маёнтку Моладава Кобрынскага павета.

Памёр Напалеон Орда ў 1883 годзе ў Варшаве. Паводле завяшчання, яго пахавалі ў Янаве (цяпер горад Іванава Брэсцкай вобласці) у радавым склепе.

Доўгі час імя нашага славутага земляка замоўчвалася на радзіме. І толькі ў незалежнай Беларусі гістарычная праўда была вернута. У горадзе Іванава Брэсцкай вобласці пастаўлены помнік мастаку, яго іменем названа вуліца ў адным з новых мікрараёнаў сталіцы, а таксама вуліцы ў Гродне і Брэсце. Іванаўскай дзіцячай школе мастацтваў было дадзена імя Напалеона Орды. У 2007 годзе ў вёсцы Варацэвічы была адкрыта карцінная галерэя Напалеона Орды. І ў гэтым жа годзе былі ўведзены ў абарачэнне памятныя манеты «Напалеон Орда. 200 гадоў». Адна з работ мастака — Нясвіжскі замак Радзівілаў — адлюстравана на грашовай купюры вартасцю ў 100 тысяч беларускіх рублёў. Пра сусветнае прызнанне творчасці Напалеона Орды сведчыць той факт, што па рашэнні міжнароднай арганізацыі ЮНЕСКА 2007 год быў аб'яўлены годам Напалеона Орды, выдатнага дзеяча беларускай і еўрапейскай культуры.

Напалеон Орда — мастак. Напалеон шмат падарожнічаў па Беларусі, Украіне, Літве і Польшчы і рабіў замалёўкі мясцін, звязаных з жыццём вядомых людзей, а таксама архітэктурных помнікаў. Таму яго творы вызначаюцца строгай дакументальнасцю і служаць каштоўнай крыніцай для гісторыкаў архітэктуры і рэстаўратараў. Тым больш, што ў наш час шматлікія аб'екты, адлюстраваныя мастаком, ужо не існуюць або значна відазмяніліся. Мастацкая спадчына Напалеона Орды налічвае больш за 1150 акварэляў і графічных работ. Сярод работ мастака асобнае месца займаюць замалёўкі Камянецкай вежы, Горы-Горацкага земляробчага інстытута, Бернардзінскага манастыра ў Віцебску, сядзіб і палацаў у Міры, Навагрудку, Нясвіжы, Гродне і інш. Свае малюнкі мастак сістэматызаваў па папках, у якіх сабраны творы за саракагадовы перыяд творчасці. У асобных папках знаходзяцца творы па Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай, Віленскай, Магілёўскай губернях, а таксама па Валынскай, Кіеўскай, Падольскай, Ковенскай губернях, Заходняй Прусіі, Галіцыі, Францыі, Іспаніі, Партугаліі і Германіі.

Значная калекцыя літаграфій з малюнкаў Н. Орды змешчана ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, але большая частка работ мастака (977 твораў) знаходзіцца ў Нацыянальным музеі Кракава (Польшча), у Народным музеі ў Варшаве. Альбом акварэляў таксама ёсць у бібліятэцы В. Стафаніка ў Львове (Украіна).

Напалеон Орда — кампазітар. Напалеон Орда напісаў вялікую колькасць музычных твораў — паланэзы, вальсы, мазуркі, серэнады, якія вылучаюцца самабытным і віртуозным стылем. Стварыў рамансы і песні, выдаў «Альбом твораў польскіх кампазітараў».

Напалеон Орда — педагог. Напалеон Орда падрыхтаваў славутую «Граматыку музыкі», якая атрымала высокую ацэнку Станіслава Манюшкі і на працягу многіх дзесяцігоддзяў заставалася непераўзыдзеным вучэбным дапаможнікам па тэорыі музыкі.

Напалеон Орда — лінгвіст. Орда з'яўляўся членам Польскага гістарычна-літаратурнага таварыства. Ён перакладаў паэзію аўтараў, ураджэнцаў беларускіх зямель, на французскую мову. Апублікаваў першы (1856 год) падручнік польскай мовы для замежнікаў.

ПАХОДЖАННЕ ПРОЗВІШЧА І СУЧАСНЫЯ ОРДЫ

Сярод навукоўцаў не існуе адзінай думкі адносна паходжання прозвішча Орда. Адны даследчыкі лічаць, што ў аснове прозвішча ляжыць мянушка, звязаная з цюркскім словам «арда» («частка роду, лагер, стаўка хана»). У старажытнарускай мове гэта слова абазначала «стан, качэўнае племя» пазней — «натоўп, скапленне народу». Паводле меркавання іншых вучоных, слова «арда» ў некаторых паўночных гаворках на тэрыторыі Расіі мае значэнне «бурундук, земляная вавёрка». На нашу думку, найбольш верагоднай з'яўляецца версія, згодна з якой імя Арда з'яўляецца размоўным варыянтам імені Ардаліён (з лацінскага ardelio — «бяздзейны чалавек») або Іардан (па назве ракі Іардан у Палесціне, дзе нарадзіўся Хрыстос). Цалкам дапушчальнай з'яўляецца таксама версія аб тым, што прозвішча Орда звязана са значэннем, якое захавалася да нашага часу ў некаторых беларускіх гаворках», беспарадак, шум». Магчыма, што гэта асаблівасць паводзін чалавека і паслужыла падставай для ўзнікнення адпаведнай мянушкі, а затым і прозвішча.

У старабеларускіх пісьмовых крыніцах прозвішча Орда неаднаразова ўпамінаецца ў XVI—XVII стст.: Богдан Орда і Сямён Орда (1565 год, Троцкі павет, попіс староства), Сямён Орда (зямянін Пінскі,1552, Пісцовая кніга Пінскага і Клецкага княстваў, складзеная ў 1552 — 1555 гг.), Уладыслаў Іаахім Орда (1669, падчашы Аршанскі, Акты Віленскай археаграфічнай камісіі).

На тэрыторыі сучаснай Беларусі прозвішча Орда (фанетыка-арфаграфічныя варыянты Арда, Ардо) і вытворныя ад яго прозвішчы Ардзевіч, Ардзін, Ардзюк, Ардзяка, Ардынаў, Ардынец, Ардыновіч, Ардынскі сустракаюцца найчасцей у Віцебскай (Пастаўскі, Аршанскі, Лепельскі, Докшыцкі, Сенненскі, Шаркаўшчынскі, Віцебскі раёны) і Гродзенскай (Воранаўскі, Іўеўскі, Карэліцкі, Бераставіцкі, Зэльвенскі раёны) абласцях. Адзначаецца гэтае прозвішча таксама ў Вілейскім раёне Мінскай вобласці, Рагачоўскім раёне Гомельскай вобласці і горадзе Мінску.

Ігар КАПЫЛОЎ.

ОАО «Дзержинский моторoремонтный завод»

Адрес: Минская область, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 6
Основной вид деятельности: ремонт с/х техники
Единицы измерения: млн руб.
ФИО руководителя: Морозов В.И. ФИО гл. бухгалтера Воронова Т.Ф.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2013 г.

АКТИВЫ	Код строки	На 31 декабря 2012 года	На 31 декабря 2011 года
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	263	237
Нематериальные активы	120	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	-	9
ИТОГО по разделу I	**190**	**263**	**246**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	63	241
В том числе:			
материалы	211	12	80
товары отгруженные	215	51	161
Расходы будущих периодов	230	27	25
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	112	16
Денежные средства и их эквиваленты	270	97	440
ИТОГО по разделу II	**290**	**299**	**722**
БАЛАНС	**300**	**562**	**968**
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	104	920
Добавочный капитал	450	2 861	2 796
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	(2 414)	(2 957)
ИТОГО по разделу III	**490**	**551**	**759**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	11	209
В том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	2	32
по авансам полученным	632	-	7
по налогам и сборам	633	-	169
по социальному страхованию и обеспечению	634	2	(6)
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	7	7
ИТОГО по разделу V	**690**	**11**	**209**
БАЛАНС	**700**	**562**	**968**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь-декабрь 2012 года

Наименование показателей	Код строки	январь–декабрь 2012 г.	январь–декабрь 2011 г.
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	127	1 089
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(292)	(1 871)
Валовая прибыль	030	(165)	(782)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	060	(165)	(782)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности	090	(165)	(782)
Доходы по инвестиционной деятельности	100	357	4 793
В том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематери-альных активов и других долгосрочных активов	101	138	4 793
проценты к получению	103	29	-
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	190	-
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(373)	(5 487)
В том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематери-альных активов и других долгосрочных активов	111	127	5 317
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	246	170
Доходы по финансовой деятельности	120	38	12
В том числе:			
прочие доходы по финансовой деятельности	122	38	12
Расходы по финансовой деятельности	130	(1)	(5)
В том числе:			
прочие расходы по финансовой деятельности	133	(1)	(5)
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности	150	21	(687)
Прибыль (убыток) до налогообложения	160	(144)	(1 469)
Налог на прибыль	170	-	(980)
Чистая прибыль (убыток)	210	(144)	(2 449)
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	(2 270)	(508)
Совокупная прибыль (убыток)	240	(2 414)	(2 957)

Информация об ОАО «ДМРЗ»

Показатели	Ед. изм.	На конец года	На начало года
4. Доля государства в уставном фонде эмитента	%	0	0
5-6. Количество акционеров, всего	лиц	62	63
в т.ч. юридических лиц	лиц	1	1
физических лиц	лиц	61	62
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном году	млн руб.	-	-
Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном году	млн руб	-	-
Обеспеченность акции имуществом общества	тыс. руб.	7,9	10,8
9. Основные виды продукции и виды деятельности: ремонт с/х техники (двигателей)			
12. Дата проведения годового общего собрания акционеров	29 марта 2013 г.		

Общество с дополнительной ответственностью «Нэкст Трейдинг Компани» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже имущества (дебиторской задолженности):

№ лота	Наименование имущества	Место нахождения имущества	Собственник	Начальная цена продажи лота, с уценкой на 20%, рублей (без учета НДС)	Задаток 5%, рублей (без учета НДС)	Сумма шага аукциона
	ИМУЩЕСТВА (без учета НДС)					
1	Дебиторская задолженность ООО «БГМ-Строй»	г. Гомель, ул. Молодости, 5	ОДО «Нэкст Трейдинг Компании»	19 095 678	954 784	954 784
2	Дебиторская задолженность ЧСУП «Тапсу»	г. Гомель, ул. Молодости, 5	ОДО «Нэкст Трейдинг Компании»	67 747 558	3 387 378	3 387 378
3	Дебиторская задолженность ЧТУП «Мидос Трейдинг»	г. Гомель, ул. Молодости, 5	ОДО «Нэкст Трейдинг Компании»	62 215 317	3 110 766	3 110 766
4	Дебиторская задолженность ОДО «Каскад-Плюс»	г. Гомель, ул. Молодости, 5	ОДО «Нэкст Трейдинг Компании»	563 861 247	28 193 062	28 193 062

Организатор торгов – управляющий в деле о банкротстве ОДО «Нэкст Трейдинг Компании» Будков Д.В.

С имуществом можно ознакомиться по месту его расположения в рабочие дни с 9.00 до 17.30.

Задаток перечисляется до 16.04.2013 г. (включительно), на р/с № 3012130990006-текущий в белорусских рублях в ОАО «Банк БелВЭБ», МФО 153001226, УНП 490499237.

Условия продажи – без условий.

С лотами можно ознакомиться с 10.00 по 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, д. 5.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 календарных дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 календарных дней после подписания протокола. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

